ВЫСОКІЯ ТЭХНАЛОГІІ НА ВАРЦЕ ПРАВАПАРАДКУ 7

ЭКАЛАГІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ – ЗАЛОГ БУДУЧЫНІ 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

29 ЖНІЎНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 168 (30302)

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей ПІШЧОЎ, начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі:

«Традыцыйна ў Беларусі адзначаецца практычна стапрацэнтнае размеркаванне. Гэта значыць, усе выпускнікі, якія навучаліся за кошт сродкаў бюджэту на дзённай форме атрымання адукацыі і якія не маюць прафесійнага вопыту, атрымліваюць першае гарантаванае працоўнае месца. Трэндам апошніх гадоў становіцца значная колькасць выпускнікоў-платнікаў, якія накіроўваюцца на першае месца работы і выкарыстоўваюць магчымасць атрымаць статус маладога спецыяліста. З году ў год каля 2 тысяч хлопцаў і дзяўчат — выпускнікоў-платнікаў універсітэтаў і каледжаў — накіроўваюцца на месца работы як маладыя спецыялісты».

КАРАТКА

- **Беларуская чыгунка з пачатку года перавезла 1 млн кантэйнераў у дваццаціфутавым эквіваленце (ДФЭ).**
- У Мінскай вобласці ў сельгасарганізацыях і буйных сялянска-фермерскіх гаспадарках падлягае ўборцы 5,2 тыс. га бульбы.
- **Урачыстая цырымонія адкрыцця Кітайскага цэнтра кнігі адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**
- Кірмашы па продажы насельніцтву сезоннай прадукцыі ў Мінскай вобласці пройдуць з 14 верасня да 2 лістапада.

ISSN 1990 — 763X

Духоўнасць

Дарога да Святыняў яднае і вучыць

Ад сцен Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора адправілася па сваім чарговым маршруце штогадовая Міжнародная навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да Святыняў» з Жыватворным Агнём ад Гроба Гасподняга. У складзе экспедыцыі — вядомыя пісьменнікі, дзеячы навукі і культуры, прадстаўнікі духавенства і грамадскіх аб'яднанняў.

Трыццаць першая па ліку экспедыцыя наведае гэтымі днямі Баранавіцкі раён, Ляхавічы, Пінск, Іванава, Драгічын, Белаазёрск і прыбудзе ў Івацэвічы, сёлетнюю сталіцу свята XXXI Дня Беларускага пісьменства.

Удзельнікі экспедыцыі правядуць у школах урокі беларускага пісьменства, выступяць перад жыхарамі ў час навуковых канферэнцый. Мабільныя групы місіянераў сустрэнуцца з працоўнымі калектывамі, выхаванцамі дзіцячых дамоў, інтэрнатаў. Будуць асвечаны месцы славы і мужнасці нашага народа, пахаванні воінаў і партызан.

Усё гэта напярадзе — кожны з пяці дзён вандроўкі будзе насычаным на падзеі. І ўжо першыя яе хвіліны, провады ад сцен старажытнага мінскага сабора абяцаюць: чарговая місія і сёлета стане паспяховай. Пасля богаслужэння ў храме было прачытана бласлаўленне ўдзельнікам экспедыцыі ад Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі. Святары ўручылі царкоўныя ўзнагароды самым сталым удзельнікам экспедыцыі за плённую працу на ніве духоўнай асветы. Усе прысутныя мелі магчымасць убачыць лампаду, запаленую ад Жыватворнага Агню ад Гроба Гасподняга, прыкласціся да цудадзейнага абраза, які стаў пуцяводным для экспедыцыі.

Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.

Па сутнасці справы

КАЛІ СВЯТА, ТО ДЛЯ ЎСІХ

З першых дзён жніўня на падрыхтоўку дзяцей да навучальнага года дапамогу атрымалі 87 працэнтаў шматдзетных сем'яў Беларусі

У нашай краіне існуе шмат механізмаў падтрымкі інстытута сям'і. Выплата аднаразовай матэрыяльнай дапамогі на падрыхтоўку дзяцей да школы — адзін з іх. Сёлета такую дзяржаўную дапамогу атрымліваюць больш за 115 тысяч шматдзетных сем'яў, выплаты пачаліся з першага жніўня. І ўсё ж пытанне фінансавай падтрымкі хоць і празрыстае, але досыць тонкае, мае мноства нюансаў, пра якія павінны ведаць бацькі або іншыя законныя прадстаўнікі дзяцей. Па тлумачэнні мы звярнуліся да начальніка ўпраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святланы БЕЛАШ.

— Святлана Мікалаеўна, хто сёння можа разлічваць на дапамогу з боку дзяржавы?

— Падтрымка аказваецца шматдзетным і малазабяспечаным сем'ям. Але важна, што ўдзел у падтрымцы бацькоў дзяцей-школьнікаў прымаюць і прафсаюзныя арганізацыі, і грамадскія аб'яднанні, а таксама звычайныя грамадзяне нашай краіны.

Шматдзетным сем'ям, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей, дзяржаўная падтрымка ў выглядзе аднаразовай матэрыяльнай дапамогі аказваецца ў рамках падпраграмы «Сям'я і дзяцінства» дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека». Памер на кожнае дзіця складае 30 працэнтаў БПМ, які дзейнічае на 1 жніўня 2023 года. Ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі аднаразовую матэрыяльную дапамогу на падрыхтоўку дзяцей да школы атрымалі ўжо больш за 110 тысяч шматдзетных сем'яў на 223,5 тысячы дзяцей. Агульная сума выплат склала 29 млн рублёў. Малазабяспечаным сем'ям, у тым ліку і шматдзетным, даецца дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

СТАР. 2-3

Спажывец

Фарбы адыходзячага лета

Кабачкі, баклажаны, кукуруза... Хто іх купляе і што з усім гэтым рабіць?

Лета пакуль што з намі, і яго апошнія дні — выдатная нагода ўключыць у рацыён «правільныя» прадукты, якія падтрымаюць імунітэт і дададуць здароўя. На прылаўках вялікіх і маленькіх рынкаў цяпер — багацце мясцовай гародніны, але сёння мы спынімся на той, якая пры досыць нізкім кошце далёка не заўсёды ўваходзіць у лік абавязковых пакупак. І — зусім незаслужана.

НЕ ТОЛЬКІ ПАДСТАВА ДЛЯ ЖАРТАЎ

Жнівень у нашых шыротах — традыцыйны час жартаў (што паўтараюцца з году ў год і ўжо надакучылі) пра кабачкі з бацькоўскіх градак, якія тыя перадаюць сваім гарадскім дзецям і ўнукам. Сапраўды, рэкордным ураджаем кабачкоў нікога ў Беларусі не здзівіш. Добра яны ў нас растуць, прычым амаль без удзелу чалавека. Вось бы так раслі, скажам, памідоры. Або кавуны.

СТАР. 11

У школу — з добрым настроем

Члены Савета Рэспублікі ўзялі ўдзел у дабрачыннай акцыі «Збяром партфель першакласніку»

У рамках акцыі Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА і члены пярвічнай арганізацыі РГА «Белая Русь» Савета Рэспублікі наведалі Сацыяльна-педагагічны цэнтр з прытулкам Ленінскага раёна г. Мінска. У навучальнай установе выхоўваюцца 22 дзіцяці ва ўзросце ад трох да 17 гадоў. Непаўналетнім, якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі, аказваецца дзяржаўная абарона і падтрымка.

Фота Belta.

«ТРЭБА ЎЖО СЁННЯ ДУМАЦЬ ПРА СВАЮ МАРУ»

Падарункі ў выглядзе канцылярскіх тавараў, прысмакаў і садавіны ад Наталлі Качанавай і членаў пярвічнай арганізацыі РГА «Белая Русь» Савета Рэспублікі атрымаў не толькі адзін першакласнік Ягор, але і ўсе выхаванцы цэнтра. Упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Мінску пагутарыла з дзецьмі, павіншавала іх з надыходзячым Днём ведаў, пажадала выхаванцам, каб новы навучальны прыносіў ім радасць і дазволіў знайсці добрых сяброў.

«У нашай краіне мы самым сур'ёзным чынам ставімся да дзяцей, пытанняў, якія іх хвалююць, — адзначыла спікер, звяртаючыся да дзяцей. — Усе настаўнікі, педагогі, выхавацелі рыхтуюцца да новага навучальнага года, каб вы маглі атрымліваць не толькі веды, але і займацца спортам, творчасцю. Вельмі хацела б, каб вам падабалася ў школе, каб вы добра вучыліся, выбралі для сябе пэўны кірунак, дзе можна было б набываць веды, якія, несумненна, спатрэбяцца ў будучыні. Трэба ўжо сёння думаць пра сваю мару. Марце, выбірайце будучую прафесію — гэта вельмі важна. І, самае галоўнае, будзьце здаровыя і шчаслівыя, сябруйце!»

Старшыня Савета Рэспублікі выказала ўдзячнасць педагогам за іх працу. «Вы робіце вельмі важную справу, сэрца і цяпло душы аддаяце нашым дзецям, а гэта вельмі важна, — лічыць Наталля Качанава. — Думаю, яны гэта з удзячнасцю прымаюць. Вы ведаеце, што Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка заўсёды ўдзяляе вялікую ўвагу дзеткам. Літаральна ўчора прайшоў вялікі Рэспубліканскі педагагічны савет, на якім ён казаў аб тым, як вучыць дзетак нашых, бо вы — наша будучыня, будучыня нашай краіны. Мы вельмі хочам, каб наша краіна была мірнай, спакойнай і квітнеючай. Усё — у вашых руках. Вы хутка падрасцяце і будзеце рабіць усё дзеля таго, каб яна такой і заставалася».

«ДЗЯРЖАВА ДЗЯЦЕЙ НЕ КІДАЕ»

Сацыяльна-педагагічны цэнтр з прытулкам Ленінскага раёна г. Мінска функцыянуе з 2005 года. «За гэты час не адна тысяча дзяцей былі нашымі выхаванцамі, — расказала **дырэктар установы Аксана ГОВЕН**. — Большасць з нашых хлопчыкаў і дзяўчат вяртаюцца ў сем'і, але, на жаль, не ўсе. Таму кожны з іх чакае ўвагі, цеплыні, клопату — як ад супрацоўнікаў нашай установы, так і ад грамадзян. Асабліва прыемна адзначыць наша даўняе сяброўства з Наталляй Іванаўнай».

Спікер рэгулярна наведвае навучальную ўстанову, дапамагае рэалізоўваць мары выхаванцаў. «Напрыклад, хлопцы і дзяўчаты наведалі Вялікі тэатр оперы і балета: для іх была арганізавана экскурсія па закуліссі, многія з іх пабывалі на спектаклі «Шчаўкунок», — удакладніла дырэктар. — Экскурсія на Белтэлерадыёкампанію прынесла дзецям шмат эмоцый і ўражанняў. Па запрашэнні Наталлі Іванаўны мы былі на экскурсіі ў Савеце Рэспублікі, дзе нас вельмі цёпла сустракалі».

Па словах **начальніка інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення сакратарыята Савета Рэспублікі, старшыні пярвічнай арганізацыі РГА «Белая Русь» Савета Рэспублікі Кацярыны РЭЧЫЦ**, члены арганізацыі, у цэлым Савет Рэспублікі традыцыйна віншуюць дзяцей з важнымі падзеямі ў іх жыцці. Не выключэннем з'яўляецца і такая важная падзея, як пачатак навучальнага года. «Вядома, хацелася б, каб дзеці пачыналі такі шлях з добрым настроем, каб для іх гэта было сапраўды радасна, — падкрэсліла Кацярына Рэчыц. — Мы з гэтымі дзецьмі сустракаемся рэгулярна, запрашаем іх у Савет Рэспублікі, дапамагаем арганізоўваць мерапрыемствы на базе іншых устаноў».

Савет Рэспублікі падтрымлівае шчыльныя адносіны з цэнтрам на працягу ўжо многіх гадоў. «Акрамя таго, лёс кожнага дзіцяці мы стараемся адсочваць, і вельмі радуе тое, што каля 50 % выхаванцаў, якія знаходзяцца ў гэтым цэнтры, вяртаюцца ў свае сем'і, — падкрэсліла старшыня пярвічнай арганізацыі РГА «Белая Русь» Савета Рэспублікі. — Нават калі дзіця не вяртаецца ў сям'ю, у яго ёсць усе неабходныя даброты, бо дзяржава дзяцей не кідае. І вельмі важна, каб грамадскія арганізацыі таксама прымалі самы непасрэдны актыўны ўдзел у стварэнні ўмоў для кожнага дзіцяці».

Вераніка КАНЮТА.

ДАБРЫНЯ ДЛЯ ЧАТЫРОХ СЭРЦАЎ

На адну шчаслівую і падрыхтаваную да новага навучальнага года сям'ю ў паўночным рэгіёне стала больш. Сёлета марафон добрых спраў Віцебскай абласной прафсаюзнай арганізацыі работнікаў АПК прыйшоў да Дзмітрыя АНТРОПАВА з Бешанковіцкага раёна, які адзін выхоўвае чатырох дзяцей.

Часта лёс падкідвае нам складаныя выпрабаванні, праз якія трэба прайсці, каб засвоіць жыццёвы ўрок. Так склалася, што былая жонка Дзмітрыя пакінула сваіх чатырох дзяцей і з'ехала наладжваць асабістае жыццё ў Расію. Дзеці, якія дагэтуль жылі з маці, аказаліся ў прытулку. Кіраўніцтва Ульскага дзяржаўнага каледжа імя Л. Даватара, дзе мужчына працуе рабочым па комплексным абслугоўванні будынкаў, працягнула руку дапамогі свайму работніку і выдзеліла два пакоі ў інтэрнаце. Сям'я аб'ядналася: цяпер тры прыгажуні пад аховай дваіх прадстаўнікоў моцнага полу — таты Дзімы і старэйшага сына Максіма.

Нягледзячы на тое, што мужчыну выхоўваць чатырох дзяцей аднаму складана, сям'я Антропавых паводзіць сябе самай шчаслівай, бо яны разам. Дзяўчынак, пакуль Дзмітрый на працы, даглядае старэйшы сын: прыгатуе паесці, навядзе дома парадак. Трынаццацігадовы Максім сёлета пойдзе ў восьмы клас, Насці — дванаццаць гадоў, а Злаце і Карыне — па дзевяць і восем адпаведна. Усе — школьнікі, таму сабраць малых аднаму было б цяжка, прызнаецца галава сям'і. Здорава, што на дапамогу Антропавым прыйшоў галіновы прафсаюз у рамках акцыі «Прафсаюзы — дзецям».

На шопінг сям'ю з Бешанковіцкага раёна ў Віцебск запрасіла **старшыня абласной прафсаюзнай арганізацыі работнікаў АПК Таццяна ДЗІКАНАВА**. Узброіўшыся добрым настроем, вялікая дэлегацыя накіравалася ва ўнівермаг. Дзяўчаты адразу згубіліся ў доўгіх радах накрухмаленых блузак і прыгожых спаднічак. А вось адзіны хлопец Максім падышоў да выбару школьнай формы цярпліва, з практычным мужчынскім поглядам. Бацька расказвае, што ў сына вялікая калекцыя розных кашуль, а да выбару паўсядзённага адзення ён ставіцца больш рацыянальна: адчувае на сабе адказнасць. У школу хлопец абраў класічныя чорныя штаны, прымераў — камфортна. Доўга круціцца перад люстэркам Максім не любіць.

Дзяўчаты выбіралі сабе новы гардэроб самі, час ад часу паварочваючыся да таты для адабрэння. І калі малодшыя Карына і Злата адразу звярнулі ўвагу на модныя сінія сарафаны, то старэйшую Насцю на спадніцу-плісэ ўгаворваў сам Максім. «Насця, ты дзяўчынка, у цябе прыгожыя доўгія ногі. Гэта ж я магу штодзень у штанах хадзіць. Ну, паглядзі, якая ты зорка!» — працягваў брат, пакуль Насця сама ў гэтым не ўпэўнілася.

Калі сям'я ўжо выходзіла з крамы з вялікімі пакетамі, Таццяна Дзіканава пацікавілася ў Насці, аб чым яна марыць. «Я чакала пачуць пра айфон або нейкія залатыя ўпрыгожванні, але сціплая дзявочая мара аказалася прасцейшай: дзяўчынка марыць прыйсці на лінейку ў Дзень ведаў у лоферах (туфлі без шнуркоў з акруглым носам. — **Заўв. «Аўт».**). Мы, канешне, не маглі не выканаць яе мару. Для кагосьці гэта звычайная справа, а хтосьці марыць аб простым абутку. Кожнае дзіця павінна быць шчаслівым», — расказвае прафсаюзны лідар аграрыяў вобласці, дапамагаючы дзяўчынцы абраць патрэбную мадэль.

Такі яркі на эмоцыі шопінг пакінуў чатырох Антропавых у захапленні, але на гэтым падарункі не скончыліся. На вуліцы сям'ю чакалі прадстаўнікі абласнога прафсаюза работнікаў АПК з канцылярыяй і іншымі прадметамі гардэроба, якія былі сабраны ў рамках унутранай акцыі. «Канешне, акцэнт зроблены на тым, каб аказаць дапамогу шматдзетным, малазабяспечаным, няпоўным сем'ям, дзе адзін з бацькоў выхоўвае дзяцей-школьнікаў. І галоўная задача — не пакінуць без увагі ні адно дзіця, каб ні адно з іх не адчула сябе абдзеленым. Каб яны, шчаслівыя, прыйшлі ў Дзень ведаў на лінейку ў прыгожай школьнай форме, з бантамі і цэлым партфелем канцылярыі. Напэўна, задача дарослых — сабраць гэты партфель мары і ўсе мары ў адзін партфель», — падзялілася Таццяна Дзіканава.

Дзмітрый Антропаў не хаваў слёз радасці і слоў падзякі. «Гэта вельмі добрая і патрэбная акцыя, вы аказалі нам значную падтрымку. Шчыры дзякуй, няхай ваша карысная справа працягваецца і прыходзіць у іншыя сем'і. Ведаеце, быць шматдзетным бацькам — гэта выдатна. Бываюць, канешне, цяжкасці, але ўсё вырашаецца. Па жыцці ўсё добра: дзеці малайцы, дапамагаюць мне і адно аднаму, я шчаслівы. Яны вельмі рады, што жывуць са мной, ганарацца мной, любяць. І я іх таксама моцна люблю», — заключыў глава сям'і.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

«ДЗЯКУЮЧЫ ПАДТРЫМЦЫ, МЫ ПОЎНАСЦЮ ГАТОВЫ ДА ШКОЛЫ»

У Гродзенскай вобласці аднаразовыя выплаты атрымалі бацькі каля 30 тысяч школьнікаў

Набліжаецца навучальны год. Бацькі прыкладаюць нямала намаганняў, у тым ліку фінансавых, каб падрыхтаваць дзяцей да школы. Затраты даволі значныя, асабліва калі ў сям'і не адзін вучань, а некалькі. У гэтых выпадках шматдзетным сем'ям, дзе выхоўваецца трое і больш дзяцей школьнага ўзросту, дзяржава ў рамках праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» на 2021—2025 гады аказвае матэрыяльную дапамогу.

Кожная сям'я разумее, колькі часу і сродкаў неабходна для таго, каб падрыхтаваць школьнікаў да пачатку новага навучальнага года. Часткова гэтыя клопаты бярэ на сябе дзяржава. У першую чаргу гэта аднаразовая матэрыяльная дапамога шматдзетным сем'ям ў памеры 30 % ад пражытачнага мінімуму. Такім чынам, выплата на кожнага вучня складае каля 130 рублёў.

У сям'і Веранікі Станеўскай шасцёра дзяцей, з якіх чацвёра школьнікаў. Самы старэйшы, Дзіма, пойдзе ў шосты клас. Як ён сам заяўляе, усё неабходнае да школы ў яго ёсць: і адзенне, і заплечнік, і ўсялякія сшыткі-алоўкі. Вядома, такая экіпіроўка дазволіць яму адчуваць сябе ўпэўнена як на ўрачыстай лінейцы, так і на занятках.

У якасці аднаразовай дапамогі сям'я атрымала каля 500 рублёў. Пры правільным размеркаванні гэта сума — значны дадатак да планавых пакупак. Закупляецца сям'я, як правіла, альбо на рынку, альбо ў павільёнах гандлёвых цэнтраў. Свой унёсак у новы школьны гардэроб робяць і бабуля з дзедам.

— Закупляемся да школы паступова. Год таму паспрабавалі закупіцца оптам, але такая практыка не вельмі ўдалая, бо шукаць адначасова рэчы на ўсіх даволі марудна. Ды і дзецям цяжка вытрымаць такі доўгі працэс. Таму сталі выязджаць па двое, — расказвае жанчына аб асаблівасцях школьнага шопінгу. — У мяне чацвёра дзяцей-школьнікаў, усе хлопчыкі. Я прызвычаілася купляць не касцюмы, а асобна штаны і кашулі. Як правіла, іх трэба некалькі. У якасці абавязковага элемента школьнага адзення купляем камізэлькі, якія таксама шырока прапаноўваюцца. Цяпер усяго хапае, выбар вялікі, прычым на любы кашалёк.

Некалькі гадоў таму сям'я атрымала кватэру ў новым мікрараёне Грандзічы. Вераніка задаволена сучасным мікрараёнам — ёсць уся неабходная інфраструктура: школа, садок, тэрыторыя прыгожа добраўпарадкавана, у кожным дварэ ўстаноўлены комплексныя дзіцячыя пляцоўкі.

— Жыллё — вельмі істотная дапамога дзяржавы, мы атрымалі яго практычна бясплатна. І хаця крэдытная лінія адкрыта на 20 гадоў, выдаткі плаціць дзяржава. Атрымліваецца прыкладна 100 рублёў за месяц. Дзецям — бясплатнае харчаванне ў школе. Таксама напалову менш аплачваем дзіцячы садок, гурткі для малодшых дзяцей. Для вялікай сям'і гэта значна, — пералічвае Вераніка льготы сваёй сям'і.

Што датычыць харчавання, дзецям яно падабаецца. З мінулага года ў школе пачаўся эксперымент, які адчувальна паўплываў на якасць ежы. Па словах Веранікі, дзеці сталі лепш есці. У меню — пельмені, піражкі, кактэйлі, раз на тыдзень — гарачы суп, дзецям такое падабаецца. І бацькі задаволены.

У хуткім часе ў сям'і пачнецца звыклы рытм жыцця. Двое дзяцей адправяцца ў садок, чацвёра — у школу, бацькі, як заўсёды, — на работу. Сама Вераніка працуе на хлебакамбінаце, яе муж — токар на заводзе. Кажа, што свядома ўладкаваліся на дзяржаўныя прадпрыемствы, бо так сям'я адчувае сябе больш упэўнена і стабільна. Ёсць свой аўтатранспарт — умяшчальны «бусік», які дапамаглі купіць бацькі Веранікі. Дарэчы, дзеці вельмі любяць бываць у вёсцы, дзе жывуць бабуля з дзедам, амаль усё лета праводзяць там. У сям'і імкнуцца, каб дзеці былі дружныя паміж сабой і не адчувалі ні ў чым патрэбы. Заўважаю, што абодва хлопчыкі трымаюць у руках далёка не танныя смартфоны. Аказалася, што такія ж ёсць ва ўсіх дзяцей.

З мамай за абноўкамі.

— Вядома, расходы ў нас значныя, — кажа Вераніка. — Але вялікая сям'я прыносіць радасць, тым больш што і дзяржава дапамагае дастаткова. Калі хтосьці скардзіцца, я заўсёды кажу: глядзіце, што робіцца ў свеце: вакол столькі жахаў, у нас — спакойная краіна, людзям даюць магчымасць працаваць, патрэбы ў асноўным задавальняюцца. Вядома, можна гаварыць аб заробках, хацелася б, каб яны былі вышэйшыя, асабліва ў выхавацеляў, педагогаў. Бо праца ў іх адказная.

Так атрымалася, што яшчэ адно знаёмства са шматдзетнай сям'ёй у многім супадае з папярэднім. У гродзенкі Вольгі Чывіль таксама чацвёра дзяцей-школьнікаў. А ўсяго сям'я выхоўвае пяцёра дзяцей. Самы малодшы ідзе ў трэці клас, старэйшая дачка — у дзявяты. Двое другіх — у восьмы і шосты. Старэйшы сын — навучэнец каледжа. Як і сям'я Веранікі, Вольга атрымала на дзяцей адрасную дапамогу ў памеры 500 рублёў. Калі ўлічваць, што на адзенне было выдаткавана 1200, то дапамога даволі адчувальная. «Усе дзеці пойдуць у школу ў абноўках. Адзенне, абутак — усё новае. У дзяўчынак — белы верх, сіні ніз. У хлопчыкаў — такі ж расклад. Абавязковыя камізэлькі школа набывае цэнтралізавана», — расказвае шматдзетная маці.

У Вольгі няпросты лёс. Яна сама сірата, муж рана памёр, у цяжарнай жанчыны на руках засталося трое дзяцей. Пасля таго, як выйшла зноў замуж, сям'я папоўнілася пятым дзіцем. У сям'і дзве кватэры — трох- і двухпакаёўкі. Жыллёвае пытанне вырашаецца такім жа чынам, як і ў папярэдняй сураэмоўніцы. Увесь крэдыт «пагашае» дзяржава. У школе харчаванне бясплатнае, за падручнікі плаціцца 50 %. Такая ж зніжка шматдзетным сем'ям і ў кніжных крамах, дзе можна набыць сшыткі і розныя канцылярскія прылады.

— Стараюся закупляцца зараней, тады ёсць магчымасць большага выбару, карыстаюся акцыямі. У мяне зарплата невялікая, атрымліваю пенсію на дзяцей, муж нядрэнна зарабляе ў будаўнічай галіне. Сямейны бюджэт стараемся размеркаваць такім чынам, каб забяспечыць дзяцей і даць ім магчымасць развіваць таленты. Калі заняткі на фартэпіяна ў дзяржаўнай установе бясплатныя, то за бальныя танцы, баскетбольную секцыю, рэпетытарства трэба плаціць па поўным тарыфе. «Я не шкадую, што ў мяне вялікая сям'я. А дзецям расказваю, як гэта добра, калі ёсць браты і сёстры, ёсць да каго звярнуцца. Я ім расказваю, што такога вопыту не мела, таму хачу, каб у дзяцей былі побач родныя душы. Здаецца, яны мяне разумеюць», — сказала Вольга на развітанне. І ў гэтым ёй можна толькі пазайздросціць.

Наведваючы школьны базар, звяртаю ўвагу на шматдзетную сям'ю з малымі дзецьмі. Аказваецца, што ў школу сёлета пойдзе старэйшы сын. На яго падрыхтоўку шматдзетнай сям'і выдзелена аднаразовая адрасная дапамога ў памеры 130 рублёў. Выдаткі бацькі выкарысталі на набыццё касцюма і кашулі.

Па словах загадчыцы аддзялення Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна Гродна Вольгі Назаравай, работа па інфармаванні сем'яў пачалася на пачатку лета, і да жніўня сем'і чатырох тысяч школьнікаў атрымалі адрасную дапамогу. Варта адзначыць, што раён — адзін з трох самых вялікіх па колькасці выплат, а адрасную дапамогу сёлета тут атрымалі на 900 чалавек больш, чым летась.

Як паведаміла галоўны спецыяліст Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага аблвыканкама Людміла Гацко, у вобласці аднаразовую матэрыяльную дапамогу да новага навучальнага года атрымаюць бацькі амаль 30 тысяч школьнікаў з 14 тысяч шматдзетных сем'яў. Агульны памер дапамог дасягае без малога чатыры мільёны рублёў. Можна сказаць, што ўсе сродкі дайшлі да сваіх адрасатаў.

Але гэта не адзіныя выплаты. Дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога на суму 150 тысяч рублёў паступіла 140 сем'ям, дзе выхоўваюцца больш за 370 дзяцей. Арганізацыі і прадпрыемствы, грамадскія аб'яднанні ў рамках дабрачынных акцый аказалі падтрымку 13 тысячам дзяцей Гродзенскай вобласці на суму 1,5 мільёна рублёў.

Для падрыхтоўкі да школы ва ўсіх раёнах прыняты дадатковыя меры па аказанні дапамогі шматдзетным і малазабяспечаным сем'ям. Прыцягваюцца сродкі арганізацый і прадпрыемстваў, грамадскіх аб'яднанняў і іншых крыніц.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.

КАЛІ СВЯТА, ТО ДЛЯ ЎСІХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Памер выплат вызначае раённая камісія. Падыход пры гэтым для кожнага выпадку індывідуальны, а вынік залежыць ад даходу сям'і і канкрэтнай жыццёвай сітуацыі. Звяртацца па дапамогу трэба ў службу «адно акно» мясцовага выканаўчага і распарадчага органа або ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва па месцы жыхарства (месцы знаходжання) аднаго з бацькоў.

— Калі можна, падрабязней аб памеры выплат і ўмовах іх атрымання.

— Аднаразовая матэрыяльная дапамога шматдзетным сем'ям даецца незалежна ад даходу сям'і. Памер дапамогі складае 129,9 рубля на кожнага школьніка ў сям'і. Звяртацца трэба ў орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароны ў адпаведнасці з рэгістрацыяй па месцы жыхарства (месцы знаходжання) аднаго з бацькоў дзіцяці, у Мінску і ў асобных раёнах Брэсцкай, Віцебскай і Гродзенскай абласцей — па месцы вучобы дзіцяці. Адрасная сацыяльная дапамога малазабяспечаным сем'ям рэалізуецца ў выглядзе аднаразовай або штомесячнай сацыяльнай дапамогі. Іх ужо атрымалі амаль дзве тысячы сем'яў на 5,5 тысячы дзяцей (на суму 4,5 млн рублёў).

— Які ўдзел у аказанні дапамогі прымаюць прафсаюзы?

— Прафсаюзныя арганізацыі штогод прымаюць актыўны ўдзел у кампаніі па падтрымцы сем'яў з дзецьмі-школьнікамі. Дарэчы, па месцы працы за кошт прафсаюзных арганізацый і наймальнікаў дапамогу атрымалі 31,6 тысячы сем'яў на 56,6 тысячы дзяцей на агульную суму каля шасці мільёнаў рублёў.

Акрамя таго, традыцыйна па ўсёй краіне праходзяць дабрачынныя акцыі, кірмашы, арганізаваныя тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дабрачыннымі фондамі і грамадскімі аб'яднаннямі, рэлігійнымі арганізацыямі, мэтай якіх таксама з'яўляецца аказанне падтрымкі сем'ям з дзецьмі. Такую дапамогу атрымалі 6,3 тысячы сем'яў на 14 тысяч дзяцей на суму 377,7 тысячы рублёў.

СЭРЦУ МАЛЕНЬКАМУ АД СЭРЦА ДОБРАГА

Як расказалі ў Міністэрстве адукацыі, жнівень — час, калі вядомыя словы аб тым, што чужых дзяцей не бывае, набываюць асаблівы сэнс: дарослых аб'ядноўвае адно жаданне — у першы школьны дзень, і не толькі, убачыць радасць у вачах кожнага без выключэння дзіцяці. Незалежна ад таго, дзе, як і кім яно выхоўваецца. Напоўніць яго заплечнік карыснымі прыладамі і прыбраць у новенькую, з іголачкі, форму. І менавіта з гэтай нагоды ў краіне стартавала адразу некалькі дабрачынных акцый. Адну з іх — «У школу з Добрым Сэрцам» на працягу дзевяці гадоў арганізоўвае і праводзіць Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Сутнасць яе ў тым, што ў буйных універмагах устаноўлены спецыяльныя скарбонкі, якія напаўняюць неабыякавыя грамадзяне. Валанцёры аказваюць дапамогу шматдзетным, няпоўным сем'ям, а таксама тым, хто трапіў у складаную жыццёвую сітуацыю. Арганізаваны збор школьнага адзення і абутку, канцылярскіх прылад, навучальных дапаможнікаў, спартыўных тавараў і іншых рэчаў, неабходных дзецям для падрыхтоўкі да навучальнага года.

Вельмі кранальная акцыя «Букет дабра», якая праводзіцца для хворых дзетак. А заключаецца яна ў тым, што клас набывае настаўніку адзін агульны букет. А грошы, якія ўдасца сэканоміць ад пакупкі, скажам, яшчэ дваццаці букетаў, хлопчыкі і дзяўчынкі збіраюць і пераводзяць у дабрачынныя арганізацыі. Такім чынам яны дапамагаюць сваім аднагодкам з анкалагічнымі, імуналагічнымі, гематалагічнымі захворваннямі.

Алена ВІНАГРАДАВА.

Канструктыўны дыялог

«ГОЛАС АРГАНІЗАЦЫІ АБ'ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫРАЗНЫ І ЗВОНКІ»

Старшыня Савета Рэспублікі сустрэлася з Пастаянным каардынатарам ААН у Беларусі

Наталля КАЧАНАВА павіншавала Расула БАГІРАВА з прызначэннем на высокую пасаду і выказала спадзяванне, што падчас яго работы ў нашай краіне супрацоўніцтва Беларусі з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый будзе плённае.

Фота БелТА.

Падчас сустрэчы.

«Мы заўсёды ганарыліся тым, што з'яўляемся краінай — заснавальніцай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, — падкрэсліла спікер. — Мы гэта вельмі шануем. Тыя пытанні, якімі займаюцца ў арганізацыі, вельмі важныя, асабліва ў сучасным свеце. Гэта і Мэты ўстойлівага развіцця, і абарона правоў дзяцей, і гендэрная палітыка, суверэннасць і незалежнасць краін. На жаль, апошнім часам мы часта чуем крытыку ў адрас гэтай арганізацыі. Напэўна, часам і справядліва. Нас папракаюць у парушэнні правоў чалавека, што абсалютна не адпавядае рэчаіснасці».

Наталля Качанава расказала аб дзейнасці Савета Рэспублікі. «Мы, парламентарыі, заўсёды імкнёмся працаваць вельмі шчыра, мы — людзі, якіх выбраў народ, — падкрэсліла яна. — Наша асноўная функцыя, акрамя заканадаўчай, — працаваць у рэгіёнах і вырашаць тыя задачы, якія стаяць перад нашымі грамадзянамі. Палітыка, якая праводзіцца ў Беларусі, міралюбівая. Абарона суверэнітэту і незалежнасці нашай краіны — гэта асноватворнае. Гэта хвалюе кожную дзяржаву, якая хоча жыць у адпаведнасці са сваімі і традыцыямі і законамі».

Спікер выказала ўдзячнасць, што падчас работы ў нашай краіне Пастаянны каардынатар ААН у Беларусі будзе бачыць, як жыве і развіваецца наша дзяржава, чым займаюцца ўлада, грамадскія арганізацыі — адпаведна, будзе дадзена аб'ектыўная ацэнка працэсам, якія адбываюцца. «У нас вельмі шмат прыкладаў добрага супрацоўніцтва з ААН», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі выказала занепакоенасць міжнароднай сітуацыяй. «Калі гіне мірнае насельніцтва — дзеці і жанчыны, — гэта нікога не можа пакінуць абыякавым, — канкрэтызавала спікер. — Наш Прэзідэнт прадастаўляў нашу тэрыторыю для ўрэгулявання канфлікту ва Украіне мірным шляхам, каб не адбывалася кровапраліцця. Наша краіна пацярпела ад чарнобыльскай аварыі, і ў сувязі з гэтым нядаўна мы прынялі заяву (у сувязі з пагрозамі ядзернай бяспекі на асобных атамных электрастанцыях. — **«Зв.»**). Сёння мы занепакоены вар'яцкімі спробамі з боку Украіны атакаваць Запарожскую атамную электрастанцыю. Гэта можа прывесці да непапраўнай катастрофы — таго, што некалі мы перажылі. Таму гэтага нельга дапусціць. І тут, вядома, голас Арганізацыі Аб'яднаных Нацый павінен быць вельмі выразны і звонкі».

З мэтай абмеркавання глабальных пагроз і выклікаў Наталля Качанава прапанавала правадзіць сумесныя мерапрыемствы.

У сваю чаргу Пастаянны каардынатар ААН у Беларусі Расул Багіраў паведаміў, што знаходзіцца ў Беларусі чатыры месяцы і паспеў пазнаёміцца з нашай краінай. «Усё, што я бачыў, мяне ўразіла, найперш — адносіны да Мэт устойлівага развіцця», — падкрэсліў ён.

Па словах Расула Багірава, ААН мае патрэбу ў рэфармаванні. «Арганізацыя не заўсёды здольная адказаць на выклікі, але іншай, якая б аб'ядноўвала ўсе краіны, сёння няма, — заўважыў ён. — Мы структура нейтральная, але справядлівасць — вышэй за ўсё».

Ён таксама адзначыў поспехі Беларусі. «Нягледзячы на тое, што адбываецца вакол, і на тыя санкцыі, якія працягваюць дзейнічаць у дачыненні да краіны, паводле міжнародных ацэнак, Беларусь выконвае 80 % усіх Мэт устойлівага развіцця, — канкрэтызаваў Пастаянны каардынатар ААН у Беларусі. — Чакаецца, што да 2030 года яна дасягне іх усіх. Гэта адзін з найлепшых паказчыкаў у Еўропе і нават у свеце».

У час сустрэчы размова ішла аб абароне сямейных каштоўнасцяў, перспектывах для моладзі, устойлівым міры як агульначалавечай каштоўнасці і іншых актуальных пытаннях, галоўнае з якіх — мір на планеце.

Як адзначыў у размове з журналістамі **Нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця ў Беларусі Сяргей ХАМЕНКА**, уражанні Пастаяннага каардынатара ААН у Беларусі аб нашай краіне самыя спрыяльныя: яны датычацца ўзроўню грамадскай бяспекі, адкрытасці людзей, чысціні ў нашай краіне.

«На сустрэчы абмяркоўвалася тэма дасягнення Мэт устойлівага развіцця ва ўсім свеце — рэалізацыі глабальнай стратэгічнай праграмы, якая прынята ААН для ўсіх краін, — сказаў Сяргей Хаменка. — Але падмуркам для ўстойлівага развіцця з'яўляецца мірнае суіснаванне ўсіх дзяржаў. Без гэтага няма ўстойлівага развіцця ні па адным з 17 кірункаў. Таму на дасягненне гэтай мэты і будуць накіраваны нашы намаганні пры рабоце з ААН, а таксама на Саміце будучыні, які адбудзецца ў верасні гэтага года».

Вераніка КАНЮТА.

Прыярытэты

З ЧЫМ МІНШЧЫНА ВЫЙДЗЕ НА НОВУЮ ПЯЦІГОДКУ?

У канцы мінулага тыдня ў Мінскім аблвыканкаме адбылося рабочае пасяджэнне, падчас якога абмяркоўваліся пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця цэнтральнага рэгіёна і выкананне бюджэту за першае паўгоддзе. Паказчыкі ў цэлым нядрэнныя, але расслабляцца рана. Карэспандэнт «Звязды» даведаўся, чым Мінская вобласць можа па праве ганарыцца, а над чым яшчэ трэба папрацаваць.

ЛЕПШЫ РЭГІЁН — ЛЕПШЫЯ ПАКАЗЧЫКІ

«Па выніках першага паўгоддзя ў Мінскай вобласці выкананы ўсе прагнозныя паказчыкі і ключавы, якім з'яўляецца валавы рэгіянальны прадукт. ВРП выконваецца на ўзроўні 107,8 працэнта, інвестыцыі — больш за 110 працэнтаў. Трэба адзначыць, што дынаміка прасочваецца і па выніках сямі месяцаў. Гэта добра, але расслабляцца рана», — адзначыў **намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Дзяніс КУРЛЕНКА** перад пасяджэннем.

Ён дадаў, што пакуль, на жаль, не змаглі выйсці на ўзровень мінулага года па экспарце — па выніках шасці месяцаў гэты паказчык складае 93,3 працэнта: «І гэта з улікам таго, што ўжо не першы год разглядаем пытанні па новых рынках збыту, вырашаем пытанні лагістыкі. Таму хацелася б, каб у дадзеным паказчыку намецілася станоўчая тэндэнцыя».

Акрамя таго, Дзяніс Курленка пазначыў і іншыя пытанні, якія прааналізавалі на пасяджэнні: «Абмяркавалі работу стратных прадпрыемстваў, падвядзем вынікі рэалізацыі праграмы «Адзін раён — адзін праект», у рамках якой ствараюцца працоўныя месцы, прыцягваюцца інвестыцыі. За мінулы перыяд гэтага года рэалізавана шэсць праектаў з 53, якія знаходзяцца ў пераліку. Агульная сума інвестыцый складзе 1,8 мільярда рублёў. Па рэалізацыі гэтых праектаў будзе створана больш за 2,5 тысячы новых працоўных месцаў», — адзначыў намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама.

ЯК ГЕНЕРЫРАВАЦЬ ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ ЗАРОБКАЎ?

Каб ствараць неабходныя для людзей умовы жыцця, развіваць населеныя пункты і іх інфраструктуру, патрэбна эфектыўная работа эканомікі. Пра гэта падчас пасяджэння сказаў **старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН**: «Не за гарамі пачатак новай пяцігодкі. Да гэтага перыяду трэба падысці з разуменнем таго, як будзем развіваць нашы рэгіёны. Гэта стварэнне працоўных месцаў, транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры. Пра гэта часта кажуць людзі, якія прыходзяць на прыёмы. Нам трэба вызначыць для сябе прыярытэты і актыўныя крокі насустрач людзям, стварэнню належных умоў жыцця. Аднак для гэтага неабходна эфектыўная работа эканомікі і адпаведныя падатковыя паступленні ў бюджэт, каб мы маглі ўсё гэта выканаць».

Паводле меркавання старшыні Мінскага аблвыканкама, эфектыўнасць эканомікі — гэта эфектыўная работа ўсіх суб'ектаў гаспадарання, ад чаго залежыць

Фота БелТА.

і ўзровень заработнай платы, без падтрымання якога прадпрыемствы акажуцца неканкурэнтнымі ў параўнанні з суседнімі краінамі. Каб генерыраваць высокі ўзровень заробкаў, павінна быць адпаведная работа, а гэта новыя мадэрнізаваныя вытворчасці. Таму ў падмурак мы павінны ставіць прыцягненне інвестыцый у асноўны капітал», — падкрэсліў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна.

Аляксандр Турчын адзначыў таксама, што ў развіццё тої ці іншай сферы неабходна пастаянна ўкладваць сродкі: «Нават на прыкладзе сацыяльных аб'ектаў гэта можна прасачыць. Калі ў рамонт аб'ектаў устаноў адукацыі ў 2019—2020 гадах мы ўклалі каля 18 мільёнаў рублёў, то сёлета — больш за 100 мільёнаў. І нам неабходна некалькі гадоў для таго, каб прывесці ў нармальны стан усе аб'екты гэтай сферы. Але каб інвеставаць у невытворчую сферу, мы павінны разумець, за кошт чаго гэта будзем рабіць. Тое ж датычыцца ўсіх галін эканомікі: ад сельскай гаспадаркі да сферы паслуг».

«КІРАЎНІКІ ПАВІННЫ ЖЫЦЬ СВАЁЙ ПРАЦАЙ»

Выніковасць работы, на думку губернатара Міншчыны, шмат у чым залежыць ад пазіцыі кіраўніка на месцах: «Кіраўнікі на месцах, пачынаючы ад старшыні выканкама, старшыні Савета дэпутатаў і заканчваючы кіраўніком прадпрыемства, павінны рухацца наперад і жыць сваёй працай. Зыходзячы з сустрэч з людзьмі, разумееш, што часам элементарныя пытанні, якія яны падымаюць, не будуць выносіцца на больш высокі ўзровень, калі на месцах у іх будуць унікаць і канструктыўна падыходзіць да вырашэння. Многія рэчы часцяком не патрабуюць вялікіх укладанняў, трэба проста слухаць людзей і прымаць рашэнні. Таму мы павінны вывучыць усе рэзервы і зразумець, у якіх пытаннях не дапрацоўваем».

У студзені—чэрвені ў вобласці пабудавалі 3,6 тысячы новых кватэр. Для тых, хто стаіць на ўліку, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 134 тысячы квадратных метраў.

Прамысловая вытворчасць вобласці — пятая частка ад усёй краіны. Дастаткова і імпартазамяшчальнай прадукцыі. За гэтае паўгоддзе яе працэнт падрос на 10,7. Ідзе ўверх і вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі — амаль на 10 працэнтаў.

У Мінскай вобласці больш за 4000 прамысловых арганізацый. Шырока вядомыя брэнды — ААТ «Беларускалій», ААТ «БелАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БелАЗ-ХОЛДЫНГ», ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат», ААТ «Гарадзейскі цукровы камбінат», ААТ «Слуцкі цукрарафінадны камбінат», ААТ «Барысаўскі завод медыцынскіх прэпаратаў», ЗАТ «Беларуская біятэхналагічная карпарацыя», ЗАТ «Аўгуст-Бел», СЗАТ «БелДжы», САТ «Алюмінтэхна».

На тэрыторыі раёнаў з колькасцю насельніцтва больш за 80 тысяч чалавек рэалізуюцца 33 інвестыцыйныя праекты. У Барысаўскім раёне — 15, Маладзечанскім — 6, Салігорскім — 12. Гэта адкрывае новыя магчымасці для развіцця гэтых рэгіёнаў.

Закранулі і тэму гарадоў-спадарожнікаў. Старшыня Мінаблвыканкама адзначыў, што прыярытэтам для развіцця павінны стаць Смалявічы. «Усе раёны павінны будуць у найбліжэйшы час вызначыць, як яны бачаць сваё развіццё ў найбліжэйшай пяцігодцы. Тады стане зразумела, як вы плануеце працаваць далей і які ўзровень у кожнага», — падсумаваў Аляксандр Турчын.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працуюць у рэгіёнах

«Дэпутат не можа быць абыякавым чалавекам»

Аб рабоце ў сваёй 74-й Вілейскай акрузе карэспандэнту «Звязды» расказала намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Святлана САКАЛОЎСКАЯ.

— Святлана Іванаўна, важны аспект у рабоце дэпутата — правядзенне прамых тэлефонных ліній і асабістых прыёмаў грамадзян. Якія пытанні сёння хвалююць жыхароў вашай акругі? Як часта людзі звяртаюцца да вас па дапамогу?

— Прамыя лініі і прыёмы праводзяцца штомесяц. З красавіка да жніўня на іх звярнулася 29 чалавек. На кантролі — і вырашэнне пытанняў, закранутых падчас перадвыбарнай кампаніі. Пераважна гэта пытанні сферы ЖКГ (стан дарог, добраўпарадкаванне і г. д.). Практычна яны — прамая кампетэнцыя органаў мясцовай улады, таму і рашэнні па іх прымаюцца на мясцовым узроўні. Чаму праблемы не вырашаліся да звароту да мяне? З некаторымі пытаннямі грамадзяне ідуць адразу да дэпутата, таму на месцах не заўсёды нават ведаюць аб іх наяўнасці. У якасці нядаўняга прыкладу — адсутнасць цырульніка ў адным з аграгарадкоў Мядзельшчыны. Пытанне вырашылася ў тыднёвы тэрмін. Вяскоўцы задаволены, а мне прыемна, што атрымалася дапамагчы!

На жаль, не ўсе пытанні вырашаюцца так хутка. Для вырашэння некаторых патрэбен час. Да ліку такіх можна аднесці якасць гандлёвага абслугоўвання насельніцтва. Гэта маніторым штомесяц. Магу з упэўненасцю сказаць, што агульнымі намаганнямі (Белкаапсаюз, Мінаблвыканкам, райвыканкамы) сітуацыю ўдалося пераламіць: сёння ў сельскіх магазінах акругі з асартыментам харчовых тавараў усё ў норме. Цэны таксама не выклікаюць пытанняў. Застаецца праблема з нехарчовай групай тавараў. Яна на кантролі, і выбаршчыкі гэта ведаюць.

Таксама не з лёту разабраліся з узнятым у Лагойскім раёне пытаннем аплаты паслуг па нармалізацыі зямельных участкаў. Спатрэбілася вывучыць пазіцыю Белдзіпразема, а затым Дзяржкаммаёмасці, якая расставіла ўсе кропкі над «і». Патрачана амаль тры месяцы, але ёсць вынік.

Немалы час пойдзе і на вырашэнне праблемы жыхароў аграгарадка Нарач Вілейскага раёна па канчатковым урэгуляванні «іх узаемаадносін» з байдарачнікамі. Вяскоўцы наракаюць на складаванне ўдзельнікамі сплаваў на байдарках у населеным пункце бытавога смецця. Як высветлілася, у заканадаўстве выразныя патрабаванні да ўрэгулявання сітуацыі, якая склалася, не прапісаны. У сувязі з гэтым Мінпрыроды плануе ў рамках падрыхтоўкі праекта закона па карэкціроўцы Воднага кодэкса Рэспублікі Беларусь прадугледзець паўнамоцтвы Саўміна на вызначэнне парадку карыстання павярхоўнымі воднымі аб'ектамі і для плавання на маламерных суднах і іншых плывучых збудаваннях. А на дадзеным этапе Вілейскім райвыканкамам прыняты меры па замене кантэйнераў для бытавога смецця на больш ёмістыя, таксама будзе кантралявацца іх своечасовы вываз.

Дэпутат не можа быць абыякавым чалавекам. Гэта датычыцца як зваротаў грамадзян, так і пытанняў узроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, якія наўпрост уплываюць на якасць жыцця насельніцтва. На рэгулярнай аснове ў акругах маніторацца гандлёвыя аб'екты на прадмет асартыменту і цэн на прадукцыю, якая рэалізуецца, вывучаецца шэраг іншых не менш важных пытанняў. Напрыклад, работа службы «Адно акно», якасць пасяўной і ўборачнай кампаніі, арганізацыя харчавання механізатараў і інш.

— Што робіцца для вырашэння праблемных пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця раёнаў?

— Як для Вілейскага, так і для Мядзельскага раёнаў сёння вельмі актуальныя пытанні прыцягнення інвестыцый у эканоміку і рэалізацыі праектаў, якія дазваляюць стварыць новыя (немалаважна — высокаплатныя) працоўныя месцы і папоўніць бюджэт. У кожным раёне ў рамках праграмы «Адзін раён — адзін праект» вытворчымі ўчасткамі Мінскага малочнага завода № 1 рэалізоўваюцца праекты па вытворчасці сыроў з белай (Вілейка) і блакітнай (аг. Нарач Мядзельскага раёна) цвіллю. Завяршэнне праектаў дасць магчымасць стварыць у сукупнасці 64 працоўныя месцы і нарасціць на 130 тон аб'ёмы вытворчасці сыроў. І гэта імпартазаміашчальныя вытворчасці. Таму рэалізацыі гэтых праектаў удзелена асаблівая ўвага, тым больш што тэрміны іх завяршэння ў мінулым годзе ўжо мяняліся.

З выездам на месца разам з кіраўніцтвам вытворчых участкаў і райвыканкамаў быў вывучаны ход рэалізацыі праектаў. Выяўлены шэраг фактараў, якія выклікаюць занепакоенасць своечасовасцю ўводу аб'ектаў у эксплуатацыю, пра іх праінфармаваны кіраўнік Мінскага малочнага завода. Прыняты дадатковыя меры, і, згодна з атрыманай інфармацыяй, сёння няма перадумоў да зрыву ўстаноўленага тэрміну (будаўнічая гатоўнасць па вілейскім участку — 70 %, мядзельскім — 55 %). Разам з тым аб'екты застаюцца на кантролі.

Згодна, што, улічваючы мой вопыт папярэдняй кантрольнай работы, працаваць са мной няпроста. У той жа час, выкарыстоўваючы яго, мясцовай уладзе павінна быць лягчэй з навядзеннем парадку. Праца ў такім тандэме атрымліваецца. Практыка работы ў рэгіёне — добрая база для работы з праектамі законаў, што паступаюць на разгляд.

— У ліпені вы наведалі людзей, якія атрымліваюць сацыяльныя паслугі на Мядзельшчыне. Сярод іх — мядзяльчане, малалетнія вязні канцлагераў Расціслаў Чарняўскі і Ларыса Каваленка. Што хвалюе гэтых людзей і наколькі важна прадстаўнікам дэпутацкага корпуса наведваць такія месцы?

— З гэтымі людзьмі сапраўды сустракалася напярэдадні 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкі захопнікаў. Важным было павіншаваць іх з гэтым святам, а таксама пазнаёміцца з умовамі жыцця і пачуць ацэнку якасці сацыяльнага абслугоўвання дома. Нягледзячы на шаноўны ўзрост, розныя ўмовы пражывання (горад і аграгарадок, кватэра і дом), у дачыненні да супрацоўнікаў сацслужбы гучалі словы падзякі. Значыць, усё робім правільна.

Сустрэчы прайшлі ў душэўнай абстаноўцы з расповедамі аб жыццёвым шляху, лёсах блізкіх людзей, дзяцей і ўнукаў. Толькі добрае, толькі светлае, з лёгкай іроніяй над сваімі памылкамі. Шмат чаму трэба вучыцца ў такіх людзей і максімальна іх далучаць да работы з падлеткамі, больш пісаць пра іх у СМІ — пра жыццё ў неймаверных умовах падчас Вялікай Айчыннай, цяжкую працу на аднаўленні краіны ў пасляваенныя гады і чыстыя (светлыя) душы, якія ўмеюць бачыць і шанаваць добрае, любіць жыццё.

— Лічаныя дні застаюцца да пачатку новага навучальнага года. Наколькі да гэтага гатовы школы вашай акругі?

— У рамках падрыхтоўкі маніторыла сітуацыю з гатоўнасцю аб'ектаў установ адукацыі да пачатку навучальнага года. Безумоўна, асноўная ўвага — сельскім школам. Выснова адназначная: зроблена вельмі многае. І заслуга ў гэтым у тым ліку бацькоў, якія зрабілі пасільны ўнёсак у добраўпарадкаванне тэрыторыі і рамонт аб'ектаў. Ёсць, вядома, асобныя недахопы, над ліквідацыяй якіх трэба будзе папрацаваць. Разам з тым гэта не паўплывае на святочную атмасферу пачатку школьных заняткаў.

Карыстаючыся выпадкам, напярэдадні 1 верасня хацелася б павіншаваць усіх з гэтым выдатным святам. І не толькі тых, хто працуе і вучыцца ў школе. Яго з трапятаннем чакаюць і былыя работнікі сістэмы адукацыі, якія знаходзяцца на заслужаным адпачынку...

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота з архіва Святланы САКАЛОЎСКАЙ.

«Захаваўшы напрацаванае, памнажаць і развіваць»

Плённым на ўзаемаадносіны з выбаршчыкамі аказаўся тыдзень працы ў сваёй, Хойніцкай, акрузе № 47 для Старшыні Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні Палаты прадстаўнікоў Жанны ЧАРНЯЎСКАЙ. Дэпутат працавала на тэрыторыі чатырох раёнаў: Хойніцкім, Рэчыцкім, Лоеўскім і Гомельскім. Акрамя прыёмаў грамадзян і тэлефонных ліній, асаблівая ўвага парламентарыя была ўдзелена ходу ўборачнай кампаніі, пытанням рэалізацыі аднаўленчых мерапрыемстваў пасля ўрагану, які пранёсся над краінай у ліпені.

Работа ў акрузе была напоўнена і шматлікімі сустрэчамі. Сярод іх — дыялогавая пляцоўка з маладымі спецыялістамі Хойніцкага раёна «Лідар нацыі — інстытуту Прэзідэнцтва 30 гадоў», якую ініцыявала і правяла дэпутат. У прэзентацыі, падрыхтаванай Жаннай Чарняўскай, наглядна паказаны шлях у 30 гадоў: як было тады і якія намаганні прыкладаліся для пераадолення крызісу і забеспячэння нармальных умоў жыцця. Старшыня Пастаяннай камісіі падзялілася і ўласным вопытам, калі працавала маладым спецыялістам у сферы гандлю. «Як сёння памятаю пустыя паліцы, талоны, мізэрныя заробкі, — згадвае парламентарый. — Таму мне было што расказаць цяперашнім маладым спецыялістам і акцэнтаваць увагу на тым, што перад імі стаіць найважнейшая задача — захаваўшы напрацаванае папярэднімі пакаленнямі, памнажаць, развіваць, выкарыстоўваючы новыя тэхналогіі».

Днямі Жанна Мікалаеўна прыняла ўдзел у дабрачыннай акцыі «Збяром партфель першакласніку», у рамках якой уручыла тром будучым школьнікам заплечнікі з самым неабходным напаўненнем.

Традыцыйна ў графіку дэпутата — прыёмы грамадзян па асабістых пытаннях, прамыя тэлефонныя лініі, сустрэчы ў працоўных калектывах і з насельніцтвам, інфармацыйна-прапагандысцкая работа з навучэнцамі і моладдзю, дыялогавыя пляцоўкі і круглыя сталы, вывучэнне дзейнасці галін акругі, наведванне ветэранаў вайны і працы, ушаноўванне і віншаванне перадавікоў, найлепшых у сваёй справе, вучобе і спорце, культуры.

Таксама Жанна Чарняўская рэгулярна праводзіць маніторынг аб'ектаў гандлю: асабіста вывучае асартымент і фарміраванне цэн. Гэтым разам дэпутата цікавіла наяўнасць школьнага асартыменту напярэдадні пачатку навучальнага года. Вывучала яна і меркаванні пакупнікоў на гэты конт.

Любімым фарматам узаемадзеяння з насельніцтвам парламентарый лічыць дыялог. «У рабоце дэпутата неабходна зваротная сувязь, — тлумачыць яна. — Заўсёды важна, каб выбаршчыкі выказвалі свае думкі па пытаннях, якія іх цікавяць. Адразу падчас сустрэчы можна абмеркаваць і растлумачыць тую ці іншую сітуацыю, прапанаваўшы алгарытм вырашэння. Шмат людзей прыходзяць са сваімі пытаннямі і праблемамі. Як правіла, яны датычацца жыццзейнасці людзей: ЖКГ, дарогі і дваровыя тэрыторыі, якасць вады і замена сетак водазабеспячэння. Рэдка, але ёсць прапановы па змяненнях і дапаўненнях у законы. Усё бяру на аловак, прапрацоўваем сумесна з калегамі, глядзім мэтазгоднасць і неабходнасць, прымаем рашэнне».

Вераніка КАНЮТА.

Унікальнае падраздзяленне

КУЗНЯ ВАРТАВЫХ ПРАВАПАРАДКУ

Штогод Цэнтр падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў МУС рыхтуе больш за 4 тысячы супрацоўнікаў

Конкурс у міліцэйскія вышэйшыя навучальныя ўстановы заўсёды высокі. Але для таго, каб служыць у органах унутраных спраў, неабавязкова ісці менавіта па гэтым шляху. Вось ужо на працягу 70 гадоў пуцёўку ў прафесію вартавых правапарадку дае і Цэнтр падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. За час свайго існавання як ён толькі не называўся, дзе не размяшчаўся, але нязменным застаецца адно: кузня міліцэйскіх кадраў, як часта называюць цэнтр, рыхтуе сапраўдных прафесіяналаў, якія самааддана служаць Айчыне.

Напярэдадні юбілею навучальнай установы карэспандэнты «Звязды» наведалі ўнікальнае падраздзяленне і даведаліся, як ажыццяўляецца навучальны працэс, арганізаваны побыт навучэнцаў і хто прыкладае намаганні для таго, каб спакой нашых грамадзян знаходзіўся пад надзейнай абаронай.

УПОР — НА ПРАКТЫКУ

Вучэбны цэнтр МУС знаходзіцца ў населеным пункце Гарані, што недалёка ад сталіцы. Сучасныя вучэбныя карпусы з найноўшай матэрыяльна-тэхнічнай базай, жылыя будынкі, спартыўны комплекс і ўласная царква, дзе рэгулярна праводзяцца богаслужэнні, — здаецца, ужо мала што нагадвае аб ваенным гарадку, які некалі тут размяшчаўся. Нягледзячы на тое, што на баланс МУС уся гэтая маёмасць перайшла больш як 30 гадоў таму, працяглы час будучых міліцыянераў рыхтавалі ў Мінску — на вуліцы К. Лібкнехта функцыянаваў Цэнтр павышэння кваліфікацыі кіруючых супрацоўнікаў і спецыялістаў МУС. У Гаранях жа вялася падрыхтоўка асабовага складу выключна для падраздзяленняў аховы Міністэрства ўнутраных спраў. Указам Прэзідэнта ў лютым 2021 года дзве навучальныя ўстановы аб'ядналі, і на тэрыторыі населенага пункта быў створаны адзіны вучэбны цэнтр МУС.

Тут рыхтуюць спецыялістаў для ўсіх падраздзяленняў міліцэйскага ведамства. Акрамя таго, рэгулярна сваю кваліфікацыю ў цэнтры павышаюць ужо дзеючыя супрацоўнікі органаў унутраных спраў. Навучальны працэс ажыццяўляецца бесперапынна — ахвотных папоўніць міліцэйскія шэрагі з кожным годам становіцца больш. Дарэчы, нямала сярод іх і дзяўчат. І гэта неабавязкова будучыя інспектары па справах непаўналетніх. Дзяўчаты паспяхова засвойваюць прафесіі ўчастковага інспектара міліцыі, супрацоўніка Дэпартамента аховы, Дэпартамента выканання пакаранняў, патрульна-паставой службы і нават байца атрада міліцыі асобага прызначэння. Патрабаванні да дзяўчат абсалютна такія ж, як і да хлопцаў. І, як кажуць выкладчыкі цэнтра, яны выдатна спраўляюцца з пастаўленымі навучальным працэсам задачамі, а потым паспяхова нясуць службу.

— Штогод у нашым вучэбным цэнтры праходзіць падрыхтоўку больш як чатыры тысячы чалавек, адначасова можа навучацца да тысячы супрацоўнікаў і курсантаў, — адзначае **начальнік Цэнтра падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў МУС палкоўнік міліцыі Аляксандр МАШКІН.** — Навучэнцам прывіваюцца веды, уменні і навыкі, якія дазволяць на высокім прафесійным узроўні выконваць задачы, ускладзеныя на органы ўнутраных спраў. Звыш 70 % навучальнага часу складаюць практычныя заняткі. Сілы выкладчыцкага складу накіраваны на адну мэту — сфарміраваць у курсантаў як мага больш навыкаў і ўменняў, якія лягуць у аснову іх будучай службовай дзейнасці. Асаблівая ўвага ўдзяляецца грамадзянска-патрыятычнаму і духоўнаму выхаванню супрацоўнікаў міліцыі.

Таксама ў цэнтры вучацца і павышаюць сваю кваліфікацыю супрацоўнікі Міністэрства юстыцыі, ваенізаванай аховы грамадзянскіх арганізацый, службы бяспекі Мінскага метрапалітэна, Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, інкасатары і іншыя. Як і будучыя міліцыянеры, яны праходзяць спецыяльную падрыхтоўку, вучацца рэагаванню на надзвычайныя здарэнні, з якімі могуць сутыкнуцца падчас службовай дзейнасці.

Вучэбны цэнтр МУС — гэта яшчэ і ўнікальная пляцоўка, дзе сабрана ўся неабходная матэрыяльна-вучэбная база для правядзення шматлікіх конкурсаў прафесійнага майстэрства міліцыянераў. Тут, напрыклад, праходзяць кваліфікацыйныя выпрабаванні на права нашэння чорнага берэта АМАП, шматлікія тактыка-спецыяльныя вучэнні.

ТРАПНЫЯ СТРАЛКІ І ТОНКІЯ ПСІХОЛАГІ

Для таго каб трапіць у вучэбны цэнтр, неабходна прыйсці ў орган камплектавання (напрыклад, раённы аддзел унутраных спраў) і расказаць аб сваім жаданні служыць. Калі вы адпавядаеце патрабаванням, якія прад'яўляюцца да супрацоўнікаў міліцыі, вам прапануюць канкрэтную спецыяльнасць (напрыклад, участковага інспектара міліцыі або супрацоўніка Дэпартамента аховы) і накіруюць вучыцца ў Гарані. На працягу 14 тыдняў вы засвоіце першапачатковую падрыхтоўку і ўжо ў якасці падрыхтаванага супрацоўніка прыступіце да сваіх службовых абавязкаў там, адкуль вас накіравалі вучыцца.

У вучэбным цэнтры рыхтуюцца спецыялісты абсалютна для ўсіх падраздзяленняў міліцэйскага ведамства: Дэпартамента аховы, Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі, Дэпартамента выканання пакаранняў, падраздзяленняў участковых інспектараў міліцыі, участковых інспектараў па справах непаўналетніх, атрада міліцыі асобага прызначэння і іншых.

Як расказвае **начальнік вучэбна-метадычнага аддзела Цэнтра падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў МУС падпалкоўнік міліцыі Таццяна ЖУКОЎСКАЯ**, спецыялізацыя для ўсіх адна — грамадская бяспека. «Аднак спецыяльная падрыхтоўка па вызначаным профілі далейшай службовай дзейнасці будзе кардынальна адрозніваца, — удакладняе яна. — Што датычыцца агнявой, фізічнай падрыхтоўкі, тут патрабаванні адзіныя для ўсіх: кожны супрацоўнік міліцыі павінен упэўнена валодаць табельнай зброяй, карэктна прымяняць фізічную сілу. Усе вартавыя правапарадку павінны валодаць асновамі аказання першай медыцынскай дапамогі, умець наладжваць кантакты з грамадзянамі ўсіх катэгорый, у тым ліку з інвалідамі. Гэтаму ўсяму вучаць у нашым цэнтры».

Ведамі з новым пакаленнем дзеляцца супрацоўнікі з багатым вопытам практычнай дзейнасці, якія ў розны час праходзілі службу ў шматлікіх падраздзяленнях міліцэйскага ведамства. Акрамя таго, гэта людзі з адпаведнай адукацыяй. Напрыклад, выкладчык, які вучыць разбіраць ў псіхалагічных момантах, мае псіхалагічную адукацыю. Юрыдычную падрыхтоўку ў цэнтры ажыццяўляюць юрысты, агнявую і фізічную — як правіла, людзі, якія ў свой час заканчвалі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры.

Што датычыцца павышэння кваліфікацыі дзеючых супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, то кожныя пяць гадоў гэта абавязковая працэдура як для малодшага начальніцкага складу, так і для афіцэраў. «Як правіла, павышэнне кваліфікацыі — гэта тая пляцоўка, калі мы імкнёмся данесці новыя патрабаванні, рэкамендацыі, якія звязаны са спецыфікай службовай дзейнасці супрацоўнікаў, расказаць аб новай тэхніцы, сродках, што ўкараняюцца ведамствам, — заўважае Таццяна Жукоўская. — Неабходную інфармацыю да слухачоў даводзяць прадстаўнікі практычных падраздзяленняў».

У НАГУ З ЧАСАМ

Вучэбная праграма пастаянна ўдасканальваецца, адаптуецца да сучасных рэалій. Напрыклад, паступілі ў Дэпартамент аховы новыя тэхнічныя сродкі і сістэмы — у абавязковым парадку іх пачынаюць вывучаць і ў цэнтры. Укараняюцца ў службовую дзейнасць новыя камп'ютарныя праграмы — карыстацца імі вучацца і курсанты, каб у падраздзяленні прыйсці падрыхтаванымі спецыялістамі. Асвойваюць будучыя супрацоўнікі органаў унутраных спраў і перспектыўны кірунак, у тым ліку для міліцэйскага ведамства, — беспілотныя лятальныя апараты.

Як расказвае **начальнік цыкла тактыка-спецыяльнай падрыхтоўкі Цэнтра падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў МУС маёр міліцыі Пётр АРЦЁМАЎ**, беспілотныя лятальныя апараты выкарыстоўваюцца практычна ва ўсіх сферах жыццядзейнасці, у тым ліку ў органах унутраных спраў. «Наша асноўная задача — ахова грамадскай бяспекі, а таму беспілотнікі ў першую чаргу выкарыстоўваюцца супрацоўнікамі патрульна-паставых службаў з мэтай ажыццяўлення маніторынгу месцаў масавага адпачынку грамадзян, — канкрэтызуе ён. — Таксама з дапамогай дронаў кантралююцца цяжкадаступныя месцы, дзе аўтапатруль не праедзе, а пешы нарад не дойдзе. Калі беспілотнік фіксуе правапарушэнне, туды адпраўляецца мабільная група. З дапамогай беспілотных лятальных апаратаў таксама ажыццяўляецца пошук людзей. Цеплавізійныя насадкі дазваляюць зафіксаваць рух нават у начны час. Беспілотнікі валодаюць шырокім функцыяналам, таму глядзім наперад, дзе мы яшчэ іх можам задзейнічаць».

Падчас заняткаў па тактыка-спецыяльнай падрыхтоўцы курсанты атрымліваюць першапачатковыя веды, якія спатрэбяцца ім падчас выканання аператыўна-службовых задач. Таксама ў іх фарміруюцца навыкі тактычных дзеянняў, яны вучацца правільна складаць працэсуальныя і службовыя дакументы, выконваць меры асабістай бяспекі пры нясенні службы.

АСНОВЫ МЕДЫЦЫНЫ І МАРАЛЬНАЯ ПАДРЫХТОЎКА

Падчас цыкла спецыяльных дысцыплін будучыя міліцыянеры асвойваюць спецыяльную тэхніку і тэхнічныя сродкі, што знаходзяцца ў арсенале органаў унутраных спраў, асновы крыміналістыкі, асновы справаводства і рэжыму сакрэтнасці, правілы асабістай і прафесійнай бяспекі. Асаблівая ўвага ўдзяляецца медыцынскай падрыхтоўцы будучых вартавых правапарадку.

«Апынуўшыся ў ліку першых на месцы здарэння, а таксама ў выніку прымянення табельнай зброі пры затрыманні правапарушальніка кожны супрацоўнік органаў унутраных спраў да прыбыцця медыкаў абавязаны аказаць першую медыцынскую дапамогу, — расказвае **начальнік цыкла спецыяльных дысцыплін Цэнтра падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў МУС падпалкоўнік міліцыі Павел РАДЧАНКА**. — Пры гэтым не мае значэння, каму патрэбна дапамога: пацярпеламу або злачынцу. Акрамя таго, вучым курсантаў самадапамозе. Улічваючы сучасныя рэаліі, укараняем у навучальны працэс элементы тактычнай медыцыны, калі дапамогу трэба аказваць непасрэдна ў экстрэмальнай сітуацыі, ва ўмовах, калі асабістая бяспека не гарантавана».

Блок сацыяльна-гуманітарных дысцыплін уключае ў сябе прафесійную этыку, асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы, юрыспрудэнцыі, прафесійна-псіхалагічную падрыхтоўку: супрацоўнік павінен быць маральна падрыхтаваны да сучасных рэалій, каб не разгубіцца ў любой сітуацыі.

Сваім унікальным вопытам з курсантамі дзеліцца **выкладчык цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Цэнтра падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў МУС палкоўнік міліцыі ў адстаўцы Міхаіл КАРПОВІЧ**, які, акрамя таго, што праходзіў службу ў міліцыі на розных пасадах, быў яшчэ і дырэктарам школы. У свой час з'яўляўся першым намеснікам начальніка Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых супрацоўнікаў і спецыялістаў МУС, выхаваў не адну плеяду будучых палкоўнікаў і генералаў міліцыі.

«Не ўсё страчана, — кажучы аб сучаснай моладзі, падкрэслівае Міхаіл Карповіч. — На адным з заняткаў я прашу курсантаў падрыхтаваць самапрэзентацыю. І маладыя людзі, асабліва тыя, якія прыехалі з глыбінкі, з такім гонарам расказваюць аб сваёй малой радзіме, аб сваіх каранях, што не можа не радаваць. Пасля навучання яны з задавальненнем вяртаюцца дахаты, каб у сваіх родных мясцінах прыносіць карысць краіне, дапамагаць землякам. Маладыя людзі, якія ў нас вучацца, становяцца прадстаўнікамі ўлады. Не сакрэт, што нярэдка па супрацоўніках міліцыі маркуюць аб уладзе ў цэлым. А таму мы рыхтуем не толькі прафесіяналаў, а яшчэ і людзей высокіх маральных прынцыпаў».

Асобная ўвага — асабістай і прафесійнай бяспецы будучых супрацоўнікаў органаў унутраных спраў. Сітуацыі бываюць розныя: ідучы на ўрэгуляванне сямейнага канфлікту, участковы не можа быць упэўнены ў тым, з якімі людзьмі яму давядзецца кантактаваць. Невыпадкова курсантаў вучаць разбірацца ў эмоцыях, жэстах людзей,

правільна выбудоўваць зносіны з самымі рознымі катэгорыямі грамадзян.

«Служыць у міліцыі не проста, а таму маладыя людзі павінны быць псіхаэмацыянальна, фізічна ўстойлівымі, — перакананы выкладчык цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. — Гэта і ненармаваны працоўны дзень, і сутыкненне з гіперэмацыянальнымі людзьмі, таму трэба быць гатовымі працаваць у любых умовах. Я кажу сваім курсантам, што вы прыйшлі ў праваахоўныя органы, а таму ваша галоўная місія — ахоўваць норму права, тое, без чаго мы жыць не можам. Служба — гэта адказнасць: перад сям'ёй, сабой і перад дзяржавай».

АПРАНУТЫ І НАКОРМЛЕНЫ

Жывуць курсанты ў камфортных інтэрнатах, для іх арганізавана трохразовае харчаванне. Увесь перыяд, пакуль ідзе адукацыйны працэс, яны знаходзяцца на тэрыторыі цэнтра кругласутачна. Прадугледжаны звальненні, падчас якіх навучэнцы выходзяць за тэрыторыю цэнтра. Аднак бывае гэта нячаста і ў выключных выпадках.

«З першых дзён знаходжання ў вучэбным цэнтры курсантам прывіваюцца навыкі нясення службы ў выглядзе сутачных нарадаў, — адзначае **начальнік курса аддзялення першапачатковай падрыхтоўкі Цэнтра падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў МУС падпалкоўнік міліцыі Аляксей КАСІНСКІ.** — Падчас нарада на КПП юны супрацоўнік міліцыі атрымлівае навыкі прапускнога рэжыму. Навык адрозніваць сапраўдныя дакументы ад падробленых спатрэбіцца любому супрацоўніку міліцыі, дзе б ён потым ні служыў. Прадугледжана патруляванне курсантамі тэрыторыі цэнтра. Ёсць нарады па сталовай і па размяшчэнні».

За кожным курсам замацаваны курсавы афіцэр, які дапамагае маладым людзям адаптавацца да новых умоў. Таксама курсавыя афіцэры сочаць за выкананнем распарадку дня, навучаюць дысцыплінарнаму статуту, асновам страявой падрыхтоўкі. Адным словам, на 14 тыдняў гэта «таты» і «мамы» курсантаў, да якіх можна звярнуцца з любым пытаннем.

Як правіла, час, праведзены ў вучэбным цэнтры МУС, пралятае вельмі хутка. На выхадзе курсанты здаюць выніковыя іспыты, якія з'яўляюцца пуцёўкай у іх далейшую службовую дзейнасць. «За 14 тыдняў хлопцы і дзяўчаты кардынальна мяняюцца, тут яны сталеюць, — рэзюмуе Таццяна Жукоўская. — З'яўляецца адказнасць, узнікае разуменне таго, што яны — будучыя прадстаўнікі ўлады. Выпускнікі нас не падводзяць — годна нясуць службу і паспяхова спраўляюцца з ускладненымі задачамі па забеспячэнні правапарадку ў краіне».

Вераніка КАНЮТА.
Фота прэс-службы Цэнтра падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў МУС.

Ноу-хау

НА ВАРЦЕ — ВЫСОКІЯ ТЭХНАЛОГІІ

Супрацоўнікі мінскай міліцыі кантралююць сітуацыю ў сталіцы ў рэжыме рэальнага часу

Часы, калі злачынцаў шукалі месяцамі і нават гадамі, сышлі ў нябыт. Той, хто думае, што схавацца ад правасуддзя нескладана, глыбока памыляецца. З кожным днём міліцэйскае ведамства ўдасканальвае свае формы работы. На дапамогу супрацоўнікам органаў унутраных спраў прыходзяць высокія тэхналогіі. Знайсці ўкрадзены аўтамабіль за лічаныя хвіліны? Выйсці на след кватэрнага злодзея? Адшукаць дзіця, якое не вярнулася дахаты? Разабрацца ў абставінах дарожна-транспартнага здарэння, калі няма сведак? Лёгка! У гэтым карэспандэнты «Звязды» пераканаліся падчас наведвання Цэнтра маніторынгу грамадскай бяспекі Галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама.

Унікальнае падраздзяленне функцыянуе ў структуры мінскай міліцыі з 2021 года. У рэжыме рэальнага часу, днём і ноччу, супрацоўнікі органаў унутраных спраў адсочваюць стан правапарадку ў грамадскіх месцах, дапамагаюць калегам з іншых падраздзяленняў аператыўна ўстанаўліваць месцазнаходжанне правапарушальнікаў і злачынцаў, шукаюць людзей, якіх па пэўных прычынах не дачакаліся дома. Усё гэта стала магчымым дзякуючы вялікай колькасці камер відэаназірання, размешчаных на тэрыторыі сталіцы.

Ад камер не схаваешся

Увесь Мінск — як на далоні. Менавіта такое ўражанне складваецца, калі ўпершыню трапляеш у Цэнтр маніторынгу грамадскай бяспекі ГУУС Мінгарвыканкама. Дзякуючы праграмнаму забеспячэнню айчынных распрацоўшчыкаў, супрацоўнікі цэнтра кантралююць абстаноўку абсалютна ва ўсіх лакацыях горада-двухмільённіка. Ні адно надзвычайнае здарэнне, нават дробнае хуліганства не застаецца па-за ўвагай міліцыянераў.

— Дапусцім, супрацоўнік крымінальнага вышуку займаецца раскрыццём крадзяжу і ў яго ёсць інфармацыя, якую ён атрымаў з лакальных сістэм відэаназірання, — расказвае **начальнік Цэнтра маніторынгу грамадскай бяспекі ГУУС Мінгарвыканкама падпалкоўнік міліцыі Яўген ХАБРАЦКІ.** — Напрыклад, нашага калегу цікавіць нумар канкрэтнага транспартнага сродку. Ён звяртаецца да нас з просьбай аказання садзейнічання ў выяўленні месцаў з'яўлення дадзенага аўтамабіля, маршруту яго перамяшчэння. Гэтую інфармацыю мы ўносім у рэспубліканскую сістэму маніторынгу і шляхам далейшага ўзаемадзеяння з супрацоўнікам органаў унутраных спраў перадаём яму інфармацыю, якая можа паўплываць на дасягненне выніку.

У тым, што пошук транспартнага сродку ажыццяўляецца аператыўна, удалося пераканацца асабіста. Супрацоўнікі цэнтра ўвялі нумар майго аўтамабіля ў сістэму — і не трэба было нікому тлумачыць, якія месцы апошнім часам я наведвала, па якім маршруце рухалася. Адным словам, зламыснік, які перасоўваецца на транспартным сродку, далёка не даедзе. І абсалютна не мае значэння, ёсць на аўтамабілі нумарны знак або яго наўмысна знялі: сістэма распазнае аўтамабіль па марцы і па колеры, нават па твары кіроўцы.

— Аналагічная сітуацыя — з пошукам асоб, — тлумачыць прынцып работы ўнікальнага праграмнага забеспячэння Яўген Хабрацкі. — Калі мы маем выяву чалавека, які знаходзіцца ў вышуку, то загружаем яе ў сістэму і можам паглядзець, на якіх аб'ектах ён з'яўляўся. Дапусцім, на якой станцыі метрапалітэна заходзіў і выходзіў, якую краму або кафэ наведваў, на якім вакзале сеў у транспартны сродак.

Па прыкладах далёка хадзіць не трэба. Нядаўна ў полі зроку сталічных вартавых правапарадку трапіў відэаролік, на якім відаць, як у раёне вуліцы Няміга рухаецца тралейбус. Са знешняга боку на ім перамяшчаўся малады чалавек — зачэпер. Дзякуючы ўнікальнай праграме міліцыянерам нескладана было ўстанавіць, на якім прыпынку правапарушальнік залез на тралейбус, у якім напрамку рухаўся і, галоўнае, дзе злез з транспартнага сродку. Праваахоўнікі аператыўна ўстанавілі асобу хулігана: ім аказаўся 28-гадовы жыхар Бабруйска. Пазбегнуць адказнасці мужчыну не ўдалося.

Затрымаць фігуранта за лічаныя хвіліны

Аналагічныя падраздзяленні маніторынгу створаны ў раённых упраўленнях унутраных спраў сталіцы, у кожным абласным падраздзяленні міліцэйскага ведамства. Аднак для больш хуткага ўстанаўлення факта або абставін правапарушэння ці злачынства міліцыянеры звяртаюцца па дапамогу да калег з ГУУС Мінгарвыканкама: магчымасці Цэнтра маніторынгу грамадскай бяспекі дазваляюць бачыць абстаноўку не толькі ў сталіцы, але і ў цэлым на тэрыторыі ўсёй краіны.

Да супрацоўнікаў, якія нясуць службу ў цэнтры, прад'яўляюцца самыя сур'ёзныя патрабаванні. Па-першае, тут працуюць выключна афіцэры. У кожнага з іх за плячыма — вышэйшая адукацыя: як правіла, юрыдычная і тэхнічная. «Супрацоўнік Цэнтра маніторынгу грамадскай бяспекі павінен валодаць уважлівасцю, уседлівасцю, кемлівасцю, мець аналітычны склад розуму, — звяртае ўвагу начальнік падраздзялення. — Аб'ём інфармацыі, з якім яны працуюць, вялікі, і гэта ўсё трэба ўмець аналізаваць, з атрыманай інфармацыі выбіраць галоўнае, бо на аснове гэтых звестак працуюць і супрацоўнікі крымінальнага вышуку, і наркакантролю, іншыя нашы калегі. Калі інфармацыя будзе выклікаць сумненне, трацціца вялікая колькасць сіл і сродкаў на яе праверку. А мы не павінны гэтага дапусціць».

Так супрацоўнікі цэнтра дапамагалі ўстанаўліваць абставіны наступнага злачынства. Пакуль удзельнік бойкі ехаў у метро, аб ім ужо ведаў увесь горад. «На лінію «102» паступіла паведамленне, што ў пераходзе станцыі метро «Каменная Горка» з лесвіцы ўпаў мужчына, знаходзіўся ён без прытомнасці, — згадвае сітуацыю **старшы інспектар Цэнтра маніторынгу грамадскай бяспекі ГУУС Мінгарвыканкама старшы лейтэнант міліцыі Аляксандр ВАЛЕНКА.** — Дзякуючы запісам камер на ўваходзе ў метро міліцыянеры высветлілі, што напярэдадні мужчына стаў удзельнікам бойкі. Малады чалавек некалькі разоў ударыў яго, скінуў з лесвіцы і ўцёк. Мы выкарысталі магчымасці рэспубліканскай сістэмы маніторынгу грамадскай бяспекі і вызначылі маршрут фігуранта. Звесткі аб тым, што хлопец, які нанёс цяжкія цялесныя пашкоджанні грамадзяніну, з'явіўся на вакзале, неадкладна перадалі ў патрульна-паставую службу Кастрычніцкага РАУС. Патрульныя зрэагавалі імгненна і па прыкметах затрымалі 25-гадовага фігуранта за лічаныя хвіліны да адпраўкі аўтобуса ў суседнюю краіну».

Ад разбору ДТЗ да дапамогі тым, хто спяшаецца ў радзільню

Выконваючы канкрэтныя задачы па пошуку парушальнікаў правапарадку, супрацоўнікі цэнтра маніторынгу працягваюць ажыццяўляць кругласутачны кантроль за грамадскімі месцамі Мінска. Лакацыі, дзе, як правіла, фіксуецца найбольшая колькасць правапарушэнняў, знаходзяцца на асаблівым кантролі. Калі бачаць нестандартныя сітуацыі, перадаюць у аператыўна-дзяжурную службу, дзе ажыццяўляецца рэагаванне. Калі паступае інфармацыя аб здзейсненым злачынстве, спецыялісты аператыўна ўстанаўліваюць месца, час, спосаб здзяйснення злачынства, а ў выніку — і вінавату асобу.

Напрыклад, міліцыянерам нескладана ўстанавіць асобы кур'ераў, якія з'яўляюцца фігурантамі злачыннай схемы «Ало, мама!». «Дзякуючы таму, што жыхары шматкватэрных дамоў сваімі сіламі ўстанаўліваюць камеры відэаназірання ў пад'ездах, такія правапарушэнні лёгка раскрываюцца, — расказвае **старшы інспектар Цэнтра маніторынгу грамадскай бяспекі ГУУС Мінгарвыканкама старшы лейтэнант міліцыі Дзмітрый ЛЕБЕДЗЕЎ.** — Атрымаўшы доступ да гэтых камер, праваахоўнікі знаходзяць фотаздымак злачынцы. Выява асобы, якую неабходна знайсці, загружаецца ў сістэму маніторынгу — адбываецца пошук. І абсалютна не мае значэння, знаходзіўся злодзей у масцы або акулярах з мэтай схаваць свой твар ці не — сістэма ў любым выпадку распазнае грамадзяніна. Мы атрымліваем інфармацыю, дзе ён з'яўляўся. Дапусцім, зразумелі, што злачынец знаходзіцца на станцыі метро «Партызанская» і рухаецца ў бок станцыі «Першамайская». Там яго ў выніку і затрымае міліцэйскі нарад».

Без асаблівых намаганняў супрацоўнікі цэнтра маніторынгу адшукаюць і таго, хто прысвоіў чужы кашалёк або іншую рэч у краме, хто вырашыў павысіць сваё фінансавае становішча з дапамогай нарказакладак, знойдуць вінаватага ў ДТЗ, які пакінуў месца здарэння. Працуюць сталічныя міліцыянеры і на прафілактыку.

«У нас жа ўдзельнікі ДТЗ не заўсёды выклікаюць супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі — вырашаюць разабрацца ў сітуацыі самастойна, складаюць еўрапратакол, — канкрэтызуе **інспектар Цэнтра маніторынгу грамадскай бяспекі ГУУС Мінгарвыканкама маёр міліцыі Ірына БАЯРЧУК.** — Калі мы бачым, што на праспекце або вуліцы з інтэнсіўным рухам адбылося дарожна-транспартнае здарэнне, перадаём інфармацыю ў ДАІ. На месца здарэння прыязджае нарад і аператыўна разбіраецца — такім чынам удаецца пазбегнуць затору. Машыны эвакуіруюцца з праезнай часткі — рух аднаўляецца».

На асаблівым кантролі — і папулярныя ў моладзі месцы адпачынку. На той жа Зыбіцкай, дзе хлопцы і дзяўчаты любяць праводзіць час, нярэдка здараюцца бойкі. Маладыя людзі спажываюць алкаголь, у выніку часта страчваюць пільнасць і ўступаюць у канфлікты. Невыпадкова там заўсёды працуе нарад міліцыі. Сітуацыю ў рэжыме рэальнага часу бачаць і ў цэнтры маніторынгу, а таму пры неабходнасці выклікаюць падмацаванне. Адным словам, магчымасці цэнтра маніторынгу дазваляюць не дапусціць больш сур'ёзных наступстваў.

Бываюць і нестандартныя сітуацыі, калі патрабуецца ўключэнне супрацоўнікаў цэнтра. Нядаўна, напрыклад, па нумары «102» звярнулася цяжарная жанчына і папрасіла дапамогі забяспечыць бесперашкодны праезд да ўстановы аховы здароўя. Супрацоўнікі цэнтра інфармавалі сваіх калег з ДАІ, якія суправаджалі жанчыну ў радзільню, аб наяўнасці пробак і накіроўвалі па найбольш аптымальным маршруце.

«Функцыянал у нашага праграмнага забеспячэння вельмі вялікі, — рэзюмуе Яўген Хабрацкі. — Інструкцыю да яго не напішаш, бо праграмнае забеспячэнне ўвесь час удасканальваецца. У горадзе з'яўляюцца новыя камеры, а ў нас — дадатковыя магчымасці. Рэгулярна агучваем распрацоўшчыку свае прапановы, што хацелася б бачыць, што трэба дапрацаваць, каб супрацоўнікі міліцыі працавалі яшчэ больш эфектыўна. Мы жывём у краіне, якая развіваецца, удасканальваецца, у тым ліку ў інтарэсах бяспекі. Таму, перш чым пайсці на парушэнне закона, трэба мільён разоў падумаць, варта гэта рабіць ці не».

Вераніка КАНЮТА.
Фота прэс-службы ГУУС Мінгарвыканкама.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 3 (78)

Супрацоўніцтва

ЭКАЛОГІЯ Ў РАМКАХ ШАС: НАДЗЕІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

У пачатку ліпеня Беларусь далучылася да краін — удзельніц Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС), адным з прыярытэтных кірункаў дзейнасці якой з'яўляецца супрацоўніцтва ў сферы аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага (устойлівага) выкарыстання прыродных рэсурсаў. Аб перспектывах Беларусі ў прыродаахоўным парадку дня арганізацыі, ключавых сустрэчах на палях Форуму краін Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва па «зялёным» развіцці расказаў намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Іван ПРЫХОДЗЬКА, які ўдзельнічаў у форуме.





Фота прэс-службы Мінпрыроды.

Фота Мікалая ЛІТВІНАВА.

— Якія магчымасці адкрываюцца перад нашай краінай у рамках удзелу ў экалагічным парадку дня ШАС?

— Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва разглядае пытанні аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага (устойлівага) выкарыстання прыродных рэсурсаў у якасці аднаго з найважнейшых кампанентаў устойлівага развіцця і забеспячэння бяспекі дзяржаў-членаў. Для плённай сумеснай работы ў гэтым кірунку прыняты шэраг дакументаў: Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, заключанае 4 ліпеня ў ходзе Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС, План па рэалізацыі Канцэпцыі супрацоўніцтва дзяржаў-членаў у галіне аховы навакольнага асяроддзя на 2025—2027 гады, План сумесных дзеянняў па рэалізацыі Праграмы «Зялёны пояс» ШАС на 2024—2026 гады і іншыя. Для эфектыўнага ўдзелу ў рэгіянальным прыродаахоўным парадку дня і ўнёску ва ўмацаванне экалагічнага вымярэння «шанхайскай дзясятку» як аднаго з найважнейшых фактараў стабільнасці ў еўразійскім рэгіёне Беларусь далучыцца да гэтых дакументаў і створанай у ліпені бягучага года Спецыяльнай рабочай групы дзяржаў — членаў ШАС па пытаннях змянення клімату, а таксама да дзейнасці Цэнтра супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя ШАС.

Акрамя таго, яшчэ да далучэння да ШАС Мінпрыроды прапрацавала пытанне стварэння Беларуска-кітайскага цэнтра па супрацоўніцтве ў галіне геалагічных навук, дзейнасць якога будзе накіравана на абмен вопытам у сферы вывучэння, разведкі, выкарыстання і аховы нетраў, інавацыямі і тэхналогіямі. Ажыццяўленне гэтага двухбаковага праекта дасць магчымасць распрацоўваць і рэалізоўваць сумесныя праграмы ў галіне геалагічнага вывучэння нетраў, узнаўлення і развіцця мінеральна-сыравіннай базы ў рамках ШАС. Адкрыццё сумеснага цэнтра пры непасрэдным удзеле кітайскіх калег запланавана на найбліжэйшы час.

— Падчас візіту беларускай дэлегацыі ў Цындаа вы правялі шэраг сустрэч з прадстаўнікамі органаў улады Расіі, Кітая, Пакістана, ААЭ, Катара, а таксама з Генеральным сакратаром ШАС. Якіх дамоўленасцяў удалося дасягнуць і па якіх кірунках будзе ажыццяўляцца далейшае супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі?

«З дэлегацыямі з Катара і Пакістана мы дамовіліся заключыць мемарандумы аб супрацоўніцтве, каб у перспектыве выйсці на рэалізацыю канкрэтных праектаў, з прадстаўнікамі Міністэрства па пытаннях змянення клімату і навакольнага асяроддзя ААЭ — стварыць рабочую групу, якая вызначыць канкрэтныя сумесныя мерапрыемствы для ўключэння ў праект Дарожнай карты па супрацоўніцтве».

— У цяперашні час з-за нарастальных глабальных экалагічных пагроз (змяненне клімату, спустошэнне прыродных рэсурсаў, страта біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці, дэградацыя экасістэм, павелічэнне назапашвання адходаў, у тым ліку пластыку) пытанні экалагічнай бяспекі выходзяць далёка за рамкі кожнай асобна ўзятай дзяржавы, набываючы планетарны характар. Менавіта таму ў міжнародных тэматычных мерапрыемствах бяруць удзел прадстаўнікі вялікай колькасці дзяржаў, якія, у сваю чаргу, выкарыстоўваюць іх як пляцоўку для правядзення двухбаковых перагавораў, абмену вопытам, наладжвання і паглыблення міжведамасных сувязяў, абмеркавання новых кірункаў супрацоўніцтва і перспектыўных праектаў. Так, на палях Форуму краін ШАС па «зялёным» развіцці беларускі бок падзяліўся з калегамі з Расіі, Кітая, Пакістана, ААЭ і Катара сваімі перадавымі практыкамі і дасягненнямі, абмеркаваў магчымыя рашэнні актуальных прыродаахоўных задач на нацыянальным і глабальным узроўнях: кліматычны парадак дня, барацьба з забруджваннем пластыкам, развіццё «зялёнай» эканомікі, укараненне прынцыпаў эканомікі замкнёнага цыкла, абыходжанне з адходамі, ахова атмасфернага паветра, захаванне біяразнастайнасці і г. д.

З дэлегацыямі з Катара і Пакістана мы дамовіліся заключыць мемарандумы аб супрацоўніцтве, каб у перспектыве выйсці на рэалізацыю канкрэтных праектаў, з прадстаўнікамі Міністэрства па пытаннях змянення клімату і навакольнага асяроддзя ААЭ — стварыць рабочую групу, якая вызначыць канкрэтныя сумесныя мерапрыемствы для ўключэння ў праект Дарожнай карты па супрацоўніцтве.

У рамках перагавораў з Генеральным сакратаром ШАС Чжанам Мінам беларуская дэлегацыя абмеркавала перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з гэтай міжнароднай арганізацыяй у прыродаахоўнай сферы. У ходзе размовы Генеральны сакратар высока ацаніў уклад нашай дзяржавы ў развіццё экалагічнага парадку дня.

— Адной з тэм вашага выступлення на панэльнай сесіі Форуму краін ШАС па «зялёным» развіцці «Асноўныя экалагічныя выклікі і практычны вопыт краін ШАС па іх пераадоленні» была праблема захавання трансгранічнага аб'екта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА «Белавежская пушча».

— Апошнія чатыры гады мы вядзём актыўную барацьбу за захаванне гэтага ўнікальнага прыроднага комплексу. Ён мае вялікую ўніверсальную каштоўнасць, паколькі ўяўляе сабой апошні ў Еўропе найбуйнейшы масіў першабытнага лесу, у якім адбываюцца натуральныя прыродныя працэсы і жыве адзін з найстаражытнейшых відаў жывёл — зубр.

Будучы беларуска-польскім трансгранічным аб'ектам сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, Белавежская пушча цяпер падзелена на дзве часткі плотам — манументальным збудаваннем, з-за якога польскім бокам быў высечаны лес, выканана адсыпка дарожнага пакрыцця пад цяжкую тэхніку і праведзена бетанаванне падмурка, а таксама іншыя работы.

У наш час чалавецтва сутыкнулася з глабальным трайным крызісам, які ўключае ў сябе не толькі змяненне клімату і забруджванне планеты пластыкам, але і страту біяразнастайнасці. Польскае загараджальнае збудаванне ўжо ўносіць свой негатыўны ўклад у паглыбленне гэтага крызісу і пагаршае сітуацыю з захаваннем біяразнастайнасці ў Белавежскай пушчы. Найбольшую занепакоенасць выклікае парушэнне гідралагічнага рэжыму, фрагментацыя ляснога комплексу і ахоўных месцапражыванняў, разрыў трансгранічных экалагічных калідораў, блакіраванне шляхоў міграцыі жывёл з далейшым збядненнем іх генафонду, высечка рэліктавых лясоў, дэградацыя асабліва каштоўных раслінных супольнасцяў, рэдкіх і тыповых біятопаў, з'яўленне новых шляхоў пранікнення чужародных відаў раслін у прыродныя экасістэмы.

Аб непазбежнасці гэтых наступстваў беларускі бок неаднаразова заяўляў яшчэ на этапе будаўніцтва загараджальнай пабудовы на такіх міжнародных пляцоўках, як ЮНЕСКА і ЮНЕП, Канвенцыя аб водна-балотных угоддзях, Канвенцыя аб ахове дзікай фаўны і флоры і прыродных асяроддзяў пражывання ў Еўропе, Канвенцыя ЕЭК аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ў трансгранічным кантэксце і інш. Аднак польскі бок пакінуў без увагі экалогію, паставіўшы на першае месца імгненныя палітычныя інтарэсы. Пры гэтым, згодна з узятымі на сябе міжнароднымі прыродаахоўнымі абавязацельствамі, ён павінен праводзіць двухбаковыя кансультацыі, калі на яго тэрыторыі плануецца ажыццяўляць дзейнасць, якая можа мець негатыўнае трансгранічнае ўздзеянне на экасістэмы сумежных краін.

Беларусь разам з нацыянальнай і міжнароднай навуковай супольнасцю змагла дабіцца сёлета ў сакавіку візіту рэактыўнай маніторынгавай місіі ЮНЕСКА/МСАП на беларускую і польскую часткі Белавежскай пушчы. Міжнародныя эксперты пацвердзілі негатыўнае ўздзеянне загараджальнай пабудовы на яе ўнікальныя экасістэмы, а таксама вызначылі патэнцыяльныя пагрозы.

Менавіта таму ў маім зваротце з трыбуны Форуму краін ШАС па «зялёным» развіцці да ўсіх яго ўдзельнікаў прагучаў заклік не дапусціць палітызацыі гэтага пытання. Тэма захаванасці Белавежскай пушчы абмяркоўвалася таксама ў рамках двухбаковых сустрэч з партнёрамі, сярод якіх былі і члены Камітэта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Пазіцыя беларускага боку важная ім з пункту гледжання забеспячэння аб'ектыўнага разгляду гэтага пытання ў далейшым на ўсіх міжнародных пляцоўках.

Упэўнены, супрацоўніцтва дзяржаў — членаў ШАС у справе захавання Белавежскай пушчы дапаможа даказаць на глабальным узроўні, што прырода не павінна быць ахвярай палітычных амбіцый асобных краін, і стане выдатным прыкладам сумеснай работы, заснаванай на ўзаемнай павазе і салідарнасці.

Александрына ПАРШЫНА.

ЗАЛОГ ПАСПЯХОВАЙ БУДУЧЫНІ

Экалагічная адукацыя — бесперапынная

Павышэнне эфектыўнасці ўзаемадзеяння па пытаннях удасканалення экалагічнай адукацыі, падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў у галіне экалогіі і прыродакарыстання — задачы надзвычайнай важнасці. З гэтай нагоды былі падпісаны дарожныя карты па развіцці супрацоўніцтва Мінпрыроды ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага (устойлівага) выкарыстання прыродных рэсурсаў на 2024—2026 гады з дзевяццю вядучымі ВНУ Беларусі.

— Сёння ў Беларусі створана шматступенная структура бесперапыннай экалагічнай адукацыі. Вызначальная роля належыць сістэмам адукацыі, падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў, — паведаміў на цырымоніі падпісання ў Рэспубліканскім цэнтры экспертызы, падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Мінпрыроды **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей МАСЛЯК.** — У развіцці пагаднення, якое напярэдадні было падпісана Мінпрыроды з Мінадукацыі, сёння зацвярджаюцца дарожныя карты. Дзякуючы іх падпісанню ў нас выбудоўваецца зразумелая вертыкаль у частцы падрыхтоўкі патэнцыяльных кадраў для работы ў сістэме Мінпрыроды.

Для забеспячэння атрымання новых навыкаў і ўдасканальвання кампетэнцый неабходна прыцягваць усе зацікаўленыя бакі, прычым не толькі органы дзяржаўнага кіравання, навуковыя арганізацыі, установы сістэмы вышэйшай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, але і патэнцыяльных работадаўцаў.

Цяпер падрыхтоўка эколагаў пачынаецца з пачатковай школы. Рэалізоўваюцца адукацыйныя праекты «Зялёныя школы», «Зялёныя школы беларускай сталіцы», накіраваныя на прыцягненне падрастаючага пакалення да даследавання навакольнага свету, фарміраванне пэўных навыкаў і ведаў, якія спатрэбяцца ў будучыні.

Наступны этап — профільныя класы. Дарэчы, сёлета з 1 верасня ў чатырох сталічных сярэдніх школах пры падтрымцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта адкрыюцца класы інжынернай накіраванасці.

— Пасля профільнай падрыхтоўкі будзе ажыццяўляцца суправаджэнне. Дзеці змогуць паступіць у вышэйшыя навучальныя ўстановы, з якімі мы сёння падпісваем дарожную карту. Усё гэта дае магчымасць не толькі вывучаць тэорыю, але і практычна дакрануцца да той работы, з якой у будучыні яны звяжуць сваё жыццё, — расказаў Сяргей Масляк.

У першую чаргу плануецца рыхтаваць работнікаў для забеспячэння развіцця мінеральна-сыравіннай базы Беларусі — геолагаў, геафізікаў. Таксама сёння запатрабаваны эколагі, у тым ліку прамысловыя, спецыялісты кантрольнай дзейнасці і іншых кірункаў прыродаахоўнага ведамства.

Дарожныя карты па супрацоўніцтве — падстава для ўзаемавыгаднага партнёрства ў перспектыўных кірунках узаемадзеяння Мінпрыроды і ВНУ. Напрыклад, прадугледжана выкананне навуковых даследаванняў у рамках навуковых праграм па заказе міністэрства, абмен вопытам у галіне аховы навакольнага асяроддзя, прыцягненне работнікаў арганізацый Мінпрыроды ў якасці кіраўнікоў або навуковых кансультантаў курсавых, дыпломных работ і магістарскіх дысертацый навучэнцаў. На базе структур, падпарадкаваных Міністэрству прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, для студэнтаў будуць арганізаваны стажыроўкі, навучальныя, пераддыпломныя практыкі, лекцыі, семінары і іншае. Вядуцца і перагаворы аб стварэнні філіялаў кафедраў ВНУ ў ведамствах Мінпрыроды для правядзення практычных і лабараторных заняткаў, курсавога, дыпломнага праектавання, вытворчай практыкі. Таксама плануецца развіццё сеткавай формы ўзаемадзеяння пры рэалізацыі вучэбнай праграмы факультатыўных заняткаў «Асновы рацыянальнага прыродакарыстання і аховы прыродных рэсурсаў» для 8—10 класаў у сталічных і рэгіянальных установах адукацыі.

Дарожныя карты па развіцці супрацоўніцтва падпісаны з Беларускім дзяржаўным універсітэтам, Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэтам, Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэтам, Беларускім дзяржаўным універсітэтам харчовых і хімічных тэхналогій, Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэтам, Віцебскім дзяржаўным універсітэтам імя П. М. Машэрава, Гомельскім дзяржаўным універсітэтам імя Ф. Скарыны, Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Я. Купалы, Баранавіцкім дзяржаўным універсітэтам.

— Па прапанове профільных вышэйшых навучальных устаноў будзе аказана падтрымка ў частцы набыцця і ўстаноўкі неабходнага абсталявання. Хочам раскрыць увесь патэнцыял першага працоўнага месца, з якім юнакі сутыкнуцца ў будучыні, прывіць ім зацікаўленасць да працы, — рэзюмаваў кіраўнік прыродаахоўнага ведамства.

— Наш універсітэт рыхтуе запатрабаваныя кадры для Мінпрыроды. Гэта горныя інжынеры, якія ўдзельнічаюць у здабычы карысных выкапняў, таму пытанні ўдасканалення падрыхтоўкі гэтых кадраў вельмі актуальныя. Здабываючы нетры, мы не павінны забываць аб экалагічнай нагрузцы зямлі. Мы ўкладваем найлепшыя методыкі, найлепшыя практыкі, якія студэнты будуць выкарыстоўваць у сваёй далейшай дзейнасці, — падкрэсліў **рэктар Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Сяргей ХАРЫТОНЧЫК**. Замацаванне супрацоўніцтва з міністэрствам, паводле яго слоў, будзе спрыяць удасканальванню адукацыйнага працэсу.

На думку **рэктара Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Ірыны КІТУРКА**, падпісанне дарожнай карты — не толькі падрыхтоўка спецыялістаў, але яшчэ і сумесныя з Мінпрыроды навуковыя даследаванні.

— Мы будзем весці разнапланавую работу па навуковых тэмах, у тым ліку па заяўках розных арганізацый міністэрства. Нашы студэнты пішуць такія дыпломныя і магістарскія работы. Вельмі важна, каб навучэнцы разумелі, што гэта рэальная работа, якая пасля абароны атрымае акт укаранення, — пракаментавала прадстаўнік Купалаўскага ўніверсітэта і расказала, што на яго базе ў дапамогу таленавітай моладзі створаны спецыяльны аддзел — Цэнтр падтрымкі студэнцкіх ініцыятыў. Адміністрацыя ўстановы імкнецца, каб усе праекты, нават самыя неверагодныя на першы погляд, атрымалі разгляд.

У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы створана моцная экалагічная школа. Менавіта яго эколагі былі ініцыятарамі руху супраць будаўніцтва агароджы на тэрыторыі Белавежскай пушчы. «Захаванне пушчы — адна з галоўных задач сёння, улічваючы, што адбываецца з польскага боку», — зрабіла акцэнт рэктар.

Упэўненасць ва ўзмацненні ўзаемадзеяння па ўсіх кірунках выказаў і **першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Дзмітрый КУРЛОВІЧ.** ВНУ традыцыйна рыхтуе для ведамстваў прыродаахоўнай сістэмы вялікі спектр спецыялістаў: геолагаў, гідраметэаролагаў, эколагаў, хімікаў, геаэколагаў. Студэнты задзейнічаны пры праходжанні практык, а таксама напісанні курсавых і дыпломных работ са спецыялістамі Мінпрыроды.

Удзельнікі падзеі выказалі надзею, што кансалідацыя намаганняў дапаможа найбольш эфектыўна раскрыць патэнцыял ВНУ і профільных арганізацый Мінпрыроды, забяспечыць будучыню галіны перспектыўнымі высокакваліфікаванымі кадрамі, захаваць прыроду і навакольнае асяроддзе Беларусі.

Александрына ПАРШЫНА.
Фота Кацярыны УРБАН.

Падрабязнасці

Экапрофільныя класы хутка адкрыюцца ў сталіцы

Выбар прафесіі — адзін з найбольш важных у жыцці. Думаць пра яго трэба загадзя, яшчэ са школьнай лавы. Сёлета ў некаторых установах сярэдняй адукацыі Мінска стартуе сумесны пілотны праект Мінпрыроды і Мінадукацыі — профільныя інжынерныя класы. Падрабязней аб факультатывах у рамках кірунку «Асновы рацыянальнага прыродакарыстання і аховы прыродных рэсурсаў» для 8—10 класаў расказала начальнік галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Мінпрыроды Таццяна КАНАНЧУК.

— Да праекта далучыліся сталічныя сярэднія школы №№ 52 і 161, а таксама гімназіі №№ 19 і 21. Галоўная мэта профільных класаў — сфарміраваць цікавасць да інавацыйных тэхналогій і прафесій, звязаных з экалогіяй і рацыянальным прыродакарыстаннем. Навучанне будзе ўключаць паглыбленае вывучэнне профільных прадметаў з арыентацыяй на вырашэнне сітуацыйных і практычных задач, навукова-праектную дзейнасць і ўдзел у профільных алімпіядах, спаборніцтвах, конкурсах і канферэнцыях. У арганізацыі адукацыйнага працэсу будуць удзельнічаць спецыялісты ведамстваў, падпарадкаваных Мінпрыроды, а таксама педагогі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, — патлумачыла Таццяна Кананчук.

Апрача заняткаў у спецыяльна абсталяваных класах, лабараторныя і практычныя работы будуць праводзіцца на кафедрах згаданых ВНУ, а таксама ў такіх установах прыродаахоўнай сістэмы, як Белгідрамет, Навукова-вытворчы цэнтр па геалогіі, «Бел НДЦ «Экалогія» і іншых.

У адпаведнасці з запытамі грамадства і дзяржавы функцыянуюць профільныя класы (групы) педагагічнай, спартыўна-педагагічнай, ваенна-патрыятычнай, аграрнай, прававой, медыцынскай, юрыдычнай, фінансава-эканамічнай, а з 2023 года — інжынернай накіраванасці. Навучанне ў іх дазваляе без уступных іспытаў паступіць у адпаведныя профільныя ВНУ.

Праектная дзейнасць спрыяе фарміраванню інжынернага мыслення, развіццю важных для гэтай прафесіі кампетэнцый: уменняў працаваць у камандзе, падзяляць адказнасць за прынятае рашэнне, аналізаваць вынікі і ацэньваць ступень дасягнення пастаўленай мэты.

— Профільныя класы — добрая дапамога бацькам і падлеткам, — лічыць прадстаўнік Мінпрыроды. — Па-першае, дзеці атрымліваюць выдатную магчымасць паспрабаваць сябе ў розных відах навукова-праектнай дзейнасці, стварыць прадукты і распрацоўкі, якія далей будуць укаранёны на рэальных вытворчасцях і ў арганізацыях, у тым ліку падпарадкаваных Мінпрыроды. Таксама падлеткі змогуць паўдзельнічаць, асабліва падчас летніх канікулаў, у экспедыцыях, маніторынгавых даследаваннях і іншых формах палявой дзейнасці нашых работнікаў і калег з БДУ, БНТУ і БДТУ. Па-другое, гэта дазваляе адкрыць схаваныя таленты, падтрымаць перспектыўных падлеткаў і падштурхнуць іх да ўсвядомленага выбару прафесіі ў галіне рацыянальнага прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя.

Александрына ПАРШЫНА.
Фота прэс-службы Мінпрыроды.

КРЫЖОВЫ ПАХОД НА ЎСХОД 2.0

Напрамак галоўнага ўдару — Украіна

20 жніўня 2024 года Вярхоўная рада Украіны прыняла закон «Аб абарone канстытуцыйнага ладу ў сферы дзейнасці рэлігійных арганізацый», які дазваляе забараніць кананічную Украінскую праваслаўную царкву. 265 дэпутатаў яго падтрымалі, пераадолеўшы неабходную планку ў 226 галасоў. Падзея не атрымала гучнага інфармацыйнага асвятлення і засталася практычна не заўважанай у сусветным парадку дня, аднак па сутнасці — гэта пераварот у сістэме міжнародных адносін і зневажанне асноватворнага права чалавека на «свабоду сумлення і рэлігіі».

Артыкул 18 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, прынятай рэзалюцыяй 217 А (III) Генеральнай Асамблеі ААН ад 10 снежня 1948 года, замацаваў, што «кожны чалавек мае права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі; гэта права ўключае свабоду змяняць сваю рэлігію або перакананні і свабоду вызнаваць сваю рэлігію або перакананні як аднаасобна, так і разам з іншымі, публічным або прыватным парадкам у вучэнні, богаслужэнні і выкананні рэлігійных і рытуальных абрадаў».

Разам з тым новы ўкраінскі закон пазбаўляе ўласных грамадзян гэтага права, прадугледжваючы забарону дзейнасці на Украіне рэлігійных арганізацый, звязаных з Рускай праваслаўнай царквой, а таксама рэлігійных аб'яднанняў, якія «займаюцца распаўсюджваннем ідэалогіі Рускага свету». Чарговы раз размова ідзе аб двайных стандартах і выбарчым тлумачэнні прававых норм. Размова не ідзе ні пра каталіцтва (з цэнтрам у Ватыкане), ні пра мусульманства (Мекка), ні пра іўдаізм (Іерусалім), ні пра будызм і дзясяткі іншых вераванняў, а выключна пра рускае праваслаўе. Пры гэтым іншыя праваслаўныя некананічныя рэлігійныя арганізацыі — самаабвешчаныя «Украінская аўтакефальная праваслаўная царква» (УАПЦ) і «Украінская праваслаўная царква Кіеўскага патрыярхату» — атрымліваюць поўную дзяржаўную падтрымку.

Па сутнасці, ва Украіне завяршаецца пачаты пасля дзяржперавароту ў лютым 2014 года працэс стварэння ў краіне з некалькіх раскольніцкіх груповак новай памеснай царквы, якая не была б звязана з кананічнай УПЦ і рускай царкоўнай традыцыяй. Прытрымліваючыся запаветаў «еўрапейскіх» царкоўных рэформатараў, сучаснае ўкраінскае кіраўніцтва паслядоўна рэалізоўвае курс на «ўмацаванне ўкраінскай духоўнай незалежнасці». А рэальна ажыццяўляе паэтапную трансформацыю свядомасці народа, навязваючы яму «сучасныя» каштоўнасці, знішчаючы праваслаўныя саборныя традыцыі і фарміруючы новую рэальнасць, у якой няма месца тысячагадовай пераемнасці.

Чарговы царкоўны раскол старанна рыхтаваўся на працягу дзесяцігоддзяў, а яго кульмінацыяй стала стварэнне 15 снежня 2018 года на базе так званага Кіеўскага патрыярхату і УАПЦ новай рэлігійнай арганізацыі, якая атрымала назву «Праваслаўная царква Украіны» (ПЦУ). Істотны ўклад у рэалізацыю гэтага плана ўнёс тагачасны прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка і Патрыярх Канстанцінопальскай праваслаўнай царквы Варфаламей.

Адначасова ажыццяўляўся мэтанакіраваны захоп храмаў і маёмасці Рускай праваслаўнай царквы пры падтрымцы ўкраінскіх улад. Паводле інфармацыі старшыні Расійскай асацыяцыі абароны рэлігійнай свабоды Сяргея Мельнікава, у перыяд з 2014 да 2023 года 1300 храмаў УПЦ былі гвалтоўным чынам адабраны і перададзены раскольнікам. У сваю чаргу Дзяржаўная служба Украіны па этнапалітыцы і свабодзе сумлення (ДСЭСС) у справаздачы прывяла даныя аб тым, што з лютага 2022 да студзеня 2024-га 968 прыходаў Украінскай праваслаўнай царквы былі перарэгістраваны ў складзе ПЦУ. Многія з іх папярэдне падвергнуты сілавому захопу.

Былі зафіксаваны дзясяткі выпадкаў вандалізму, у тым ліку падпалаў, у адносінах да праваслаўных храмаў. Некалькі цэркваў і капліц УПЦ былі знесены (Кіеў, Львоў і іншыя). Так, у ноч на 17 мая 2024 года ў Кіеве была знесена Уладзіміра-Вольгінская капліца Дзесяціннага храма, які належыць УПЦ.

Украінскае кіраўніцтва планава знішчае праваслаўе і іерархаў царквы. Згодна з данымі Дзярждэпартамента, Служба бяспекі Украіны (СБУ) з 2022 года правяла 41 тыс. расследаванняў у дачыненні да УПЦ за нібыта супрацоўніцтва з Расіяй і абшукала 350 царкоўных будынкаў. У якасці матывіроўкі сваіх дзеянняў прадстаўнікі спецслужбы заяўлялі аб датычнасці служыцеляў царквы да распаўсюджвання ідэй, «якія замахваюцца на тэрытарыяльную цэласнасць Украіны».

Увогуле, з лютага 2022 года да сакавіка 2024-га СБУ завяла 80 крымінальных спраў у дачыненні да святароў і архіерэяў УПЦ па артыкулах аб дзяржздрадзе, «дапамаганні краіне-агрэсару» і «распальванні рэлігійнай варожасці». 37 святарам УПЦ былі прад'яўлены абвінавачанні, 23 чалавекі атрымалі судовыя прыгаворы. Некалькі арыштаваных і асуджаных святароў абмянялі на ўкраінскіх ваеннапалонных і перадалі Расіі. Украінскага грамадзянства пазбаўлены 19 епіскапаў і святароў УПЦ. У іх ліку — мітрапаліты Іанафан і Мялецій (Ягоранка), мітрапаліт Днепрапятроўскі і Паўлаградскі Ірыней (Сярэдній), намеснік Свята-Успенскай Святагорскай лаўры мітрапаліт Святагорскі Арсеній (Якавенка), мітрапаліт Хуслькі Марк (Пятроўцаў), архіепіскапы Бучанскі Панцеляймон (Башчук) і Арцызскі Віктар (Быкаў) і іншыя.

«Парушэнне правоў Украінскай праваслаўнай царквы (УПЦ) урадам Украіны суправаджаецца збоем у сістэме міжнароднага рэагавання на пагрозы рэлігійнай свабодзе. Кадры захопу храмаў і бясчынства ў манастырах дзякуючы сацсеткам абышлі ўвесь свет. Але арганізацыі, якія дзесяцігоддзямі займаюцца мабілізацыяй грамадскай думкі на тэму рэлігійнай свабоды, маўчаць наконт украінскіх праваслаўных. Урадавыя агенцтвы не рашаюцца крытыкаваць рэлігійную палітыку Кіева. Бо Незалежная знаходзіцца на перадавой барацьбы заходняй «дэмакратыі» і ўсходняй «тыраніі», а яе кіраўніцтва слепа выконвае ўсе ўстаноўкі Вашынгтонскага абкама».

Парушэнне правоў Украінскай праваслаўнай царквы (УПЦ) урадам Украіны суправаджаецца збоем у сістэме міжнароднага рэагавання на пагрозы рэлігійнай свабодзе. Кадры захопу храмаў і бясчынства ў манастырах дзякуючы сацсеткам абышлі ўвесь свет. Але арганізацыі, якія дзесяцігоддзямі займаюцца мабілізацыяй грамадскай думкі на тэму рэлігійнай свабоды, маўчаць наконт украінскіх праваслаўных. Урадавыя агенцтвы не рашаюцца крытыкаваць рэлігійную палітыку Кіева. Бо Незалежная знаходзіцца на перадавой барацьбы заходняй «дэмакратыі» і ўсходняй «тыраніі», а яе кіраўніцтва слепа выконвае ўсе ўстаноўкі Вашынгтонскага абкама.

На гэтым фоне камічна выглядае справаздача Дзярждэпартамента ЗША «Аб свабодзе веравызнання за 2023 год (Беларусь)», змешчаная на афіцыйным сайце арганізацыі ў лістападзе 2024 года. У яе рамках крытыкуюцца асобныя палажэнні новай рэдакцыі беларускага Закона «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» у частцы, якая датычыцца «забароны рэлігійнай дзейнасці незарэгістраваных груп і палітычнай дзейнасці рэлігійных суполак; недапушчэння падтрымкі і фінансавання палітычных партый з боку рэлігійных аб'яднанняў, пашырэння падстаў для закрыцця абшчын (тэрарызм, экстрэмізм, дзеянні супраць суверэнітэту краіны); абавязковай перарэгістрацыі рэлігійных арганізацый (на працягу года) і неабходнасці папярэдняга дазволу ўлад на ўвоз і распаўсюджванне рэлігійнай літаратуры». У заключэнні дакумента падкрэсліваюцца намаганні супрацоўнікаў Пасольства ЗША па ўзаемадзеянні з рэлігійнымі лідарамі і актывістамі грамадзянскай супольнасці ў частцы, што датычыцца пытанняў свабоды веравызнання, уключаючы рэгістрацыю рэлігійных суполак, ціску дзяржавы на духавенства, свабоды выказваць і вызнаваць рэлігійныя перакананні, свабоды выказвання меркаванняў для духавенства.

Усё гэта сведчыць аб істотных перакосах у ацэнках стандартаў рэлігійнай свабоды ў заходняй парадыгме светаўладкавання. Рэальнае знішчэнне праваслаўя на Украіне, яго заканадаўчая абструкцыя з боку «майданнай улады» і фізічная ліквідацыя падаюцца нормай, якая не патрабуе асуджэння. Паколькі яны выразна ўкладваюцца ў рэчышча тэорыі сутыкнення цывілізацый Хантынгтана і ідэй рэлігійнай дыпламатыі Мадлен Олбрайт, сфармуляваных яшчэ ў канцы XX стагоддзя.

Традыцыйна ў амерыканскіх справаздачах дзяржавы-цывілізацыі Расія, Кітай, Індыя, шматканфесійныя дзяржавы Блізкага і Сярэдняга Усходу, якія маюць шматвяковы вопыт суіснавання розных рэлігій і канфесій, знаходзяцца ў спісе «краін, якія выклікаюць асцярогі». Заходні наратыў не прымае рэлігійную цярпімасць, а накіраваны на гвалтоўнае навязванне ўласных догмаў і канонаў, апагеем якога з'яўляюцца рэлігійныя войны і крыжовыя паходы. Чарговы з якіх мае месца сёння ва Украіне.

Гістарычныя памкненні заходняга свету па «пашырэнні ўласнай жыццёвай прасторы, захопе рэсурсаў і прывядзенні нецывілізаваных народаў ва ўлонне сапраўднай царквы» абярнуліся для нашых продкаў рэкамі крыві, прыгнётам і горам. Беларусь увесь час была ў эпіцэнтры падзей, а наш народ на ўласным вопыце адчуў, што такое рэлігійная варожасць. Невыпадкова гэтаму кірунку ўдзяляецца самая пільная ўвага нашым Прэзідэнтам — А. Р. Лукашэнкам.

14 сакавіка 2024 года на сустрэчы з Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы беларускі лідар падкрэсліў: «Усе самыя кровапралітныя войны на зямлі пачыналіся на глебе рэлігійных рознагалоссяў. Гэтую карту і сёння разыгрываюць ідэолагі каляровых рэвалюцый і мяцяжоў. У такіх умовах важна захаваць роўнасць правоў і дыялог паміж прадстаўнікамі ўсіх вераванняў. Бо яшчэ Уладыка Філарэт адзначаў, што міжканфесіянальны свет — галоўнае дасягненне Беларусі».

Сёння наймагутнейшы ўдар наносіцца па гістарычнай праўдзе, маральных каштоўнасцях і свядомасці людзей. Задзейнічаны самыя сучасныя тэхналогіі маніпулявання індывідуальнай і групавой свядомасцю, прыцягнуты ўсе магчымыя інфармацыйныя сродкі і вядучыя паліттэхнолагі.

Як сведчыць практыка, наравне з рэальным полем бою «бітва цывілізацый» перамясцілася ў ментальную прастору і сферу сэнсаў. Сфарміраваць новыя наратывы, у якіх няма месца любові і спачуванню, душэўнасці і духоўнасці, супераджванню і чалавечнасці, а ёсць пакланенне залатому цяльцу, мамоне і ўласным капрызам, — у гэтым галоўная мэта ўсіх намаганняў заходніх дэмакратызатараў.

Там, дзе пануе беззаконне, культывуецца правы нацыяналізм і заахвочваецца фашызм, добра ўзыходзяць парасткі сектанцтва, ілжэвучэнняў, рэлігійнай нецярпімасці. Усё гэта мае месца на тэрыторыі нашай суседкі Украіны. На дзяржаўным узроўні

«Сёння наймагутнейшы ўдар наносіцца па гістарычнай праўдзе, маральных каштоўнасцях і свядомасці людзей. Задзейнічаны самыя сучасныя тэхналогіі маніпулявання індывідуальнай і групавой свядомасцю, прыцягнуты ўсе магчымыя інфармацыйныя сродкі і вядучыя паліттэхнолагі».

апраўдваецца і заахвочваецца беззаконне і знішчэнне той самай свабоды сумлення і рэлігіі, аб якіх успамінаюць толькі, калі гэта датычыцца заходніх праектаў.

